Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

19 ЖНІЎНЯ 2008 г.
АЎТОРАК
№ 154
(26267)

Кошт 450 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Фота БЕЛТА.

Андрэй АРАМНАЎ, алімпійскі чэмпіён-2008 у Пекіне па цяжкай атлетыцы:

«СВАЕ ПЕРШЫЯ СПАРТЫЎНЫЯ РЭКОРДЫ Я ПАЧАЎ УСТАНАЎЛІВАЦЬ З 14 ГАДОЎ ЯШЧЭ Ў ШКОЛЕ»

Учарашняе выступленне беларускага цяжкаатлета Андрэя Арамнава (105 кг) на пекінскім памосце BUAA Gymnasium стала сапраўдным фурорам на фоне ўсіх папярэдніх спаборніцтваў у гэтай дысцыпліне. Яшчэ б: 20-гадовы асілак з Барысава змог устанавіць адразу 3 сусветныя рэкорды і выйграць з фенаменальнай вагой у суме — 436 кг. А яшчэ Андрэй развязаў на скарбонцы беларускай каманды «гордзіеў вузел» і кінуў туды першае «золата». Як паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў цяжкаатлета з гэтай узнагародай.

Пасля ўрачыстай цырымоніі ўзнагароджвання і абавязковай прэс-канферэнцыі наваспечаны чэмпіён з задавальненнем падзяліўся сваімі ўражаннямі.

— Я бязмежна шчаслівы, што дасягнуў сваёй доўгачаканай мары — стаў алімпійскім чэмпіёнам. Пры гэтым я разлічваў яшчэ разам з залатым медалём устанавіць сусветныя рэкорды. І мне гэта ўдалося.

— Як табе, 20-гадоваму юнаку, удалося стрымаць эмоцыі ў кампаніі мацёрых сапернікаў, якія гатовыя былі цябе «з'есці», вар'іруючы падчас спаборніцтваў свае падходы да штангі, прыбаўляючы альбо змяншаючы вагу?

— Тут мне хочацца сказаць вялікі дзякуй трэнерскаму штабу, які планаваў тактыку і стратэгію. Але ж я быў добра гатовы псіхалагічна, і выбіць мяне з раўнавагі нейкімі маніпуляцыямі вельмі складана. Дарэчы, узрост — для штангі зусім не перашкода. Свае першыя рэкорды я пачаў устанаўліваць з 14 гадоў яшчэ ў школе ў Барысаве.

— Трэба меркаваць, што першы трэнер, родныя і блізкія падчас гэтай неверагоднай «гонкі» трымалі кулакі сціснутымі?

— Не сумняваюся ў гэтым. Карыстаючыся момантам, мне хочацца сказаць вялікі дзякуй майму першаму трэнеру Уладзіміру Вітальевічу Бараздакову, дырэктару Барысаўскай ДЗЮСШ Сяргею Сцяпанавічу Зарэмбе, цяперашняму настаўніку Міхаілу Мікалаевічу Солдыру, галоўнаму трэнеру Аляксандру Васільевічу Ганчарову і ўсім тым, хто дапамагаў мне ісці па жыцці. Асабліва ўдзячнасць маёй маме Тамары Анатольеўне, якая нарадзіла мяне, вырасціла і вывела ў людзі.

— У цябе былі цяжкія моманты ў кар'еры?

— Як і ў кожнага чалавека, у мяне ў жыцці здараліся белыя і чорныя палосы. Адна з іх прыйшлася на 2006 год, калі я пашкодзіў спіну і не трапіў на чэмпіянат свету ў Дамініканскую Рэспубліку, хоць быў выдатна гатовы. Мае вельмі доўга і цяжка даводзілася выходзіць на нармальны ўзровень. На жаль, у гэты нялёгкі для мяне жыццёвы адрэзак знаходзіліся людзі, якія былі гатовыя паставіць на мне крыж. Я не трымаю на іх зла і хачу проста сказаць ім дзякуй. Іх імкненне мяне спісаць з рахункаў прымусіла ўзяць па-сапраўднаму сябе ў рукі і аднойчы сказаць сабе: усё, Андрэй, хопіць. Час пачынаць жыццё па-новаму. І ведаеце, Усявышні быццам бы пачуў мяне і неяк усё пайшло гладка. Я ўдзячны свайму лёсу.

— Якое зараз у цябе самае запаветнае жаданне?

— А як вы думаеце? Безумоўна, добра адпачыць. Я зараз сябе ўяўляю на моры...

— З прыгожай дзяўчынай?

— А чаму б і не. Дарэчы, зараз у мяне ёсць дзяўчына, праўда, жанаціцца пакуль не збіраюся — не падрыхтаваны да гэтага важнага жыццёвага кроку. Ды і ў гэтай справе няварта спяшацца.

— Пасля добрага адпачынку ты не баішся страціць форму?

— Не баюся, бо я задаўся для сабе адной жыццёвай мэтай і зараз імкнуся ісці па жыцці раўнамерна і ўпэўнена. Зрэшты, мне хацелася б перадаць журналістам, каб у пачатку сезона мяне не судзілі строга, калі я не буду паказваць высокія вынікі. Для сябе я ведаю, калі трэба «стрэліць», а ў перапынку паміж баямі магу выбрацца і ашчадны рэжым. Праўда, пры гэтым заўсёды магу прыбавіць і штурмаваць усё новыя рэкорды.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ, *г. Пекін.*

МЕДАЛЬНЫ ЗАЛІК

Месца	Краіна	Золата	Серабро	Бронза	Усяго
1.	Кітай	39	14	14	67
2.	ЗША	20	23	26	69
3.	Вялікабрытанія	12	7	8	27
4.	Аўстралія	11	10	12	33
5.	Германія	9	7	7	23
6.	Расія	8	13	15	36
7.	Паўднёвая Карэя	8	9	6	23
8.	Японія	8	5	7	20
9.	Італія	6	6	6	18
10.	Украіна	5	3	8	16
11.	Францыя	4	10	13	27
12.	Румынія	4	1	3	8
13.	Нідэрланды	3	5	4	12
14.	Іспанія	3	3	2	8
15.	Славакія	3	1	0	4
16.	Польшча	2	3	1	6
17.	Чэхія	2	3	0	5
18.	Канада	2	2	4	8
19.	Ямайка	2	2	0	4
20.	Паўночная Карэя	2	1	3	6
21.	Новая Зеландыя	2	1	3	6
22.	Эфіопія	2	1	0	3
23.	Швейцарыя	2	0	3	5
24.	Грузія	2	0	1	3
25.	Куба	1	5	5	11
26.	**Беларусь**	**1**	**3**	**7**	**11**
27.	Казахстан	1	3	4	8
28.	Зімбабвэ	1	3	0	4
29.	Азербайджан	1	2	2	5
30.	Кенія	1	2	2	5
31.	Нарвегія	1	2	1	4
32.	Інданезія	1	1	3	5
33.	Данія	1	1	3	5
34.	Славенія	1	1	2	4
35.	Балгарыя	1	1	1	3
36.	Фінляндыя	1	1	1	3
37.	Манголія	1	1	0	2
38.	Бразілія	1	0	5	6
39.	Тайланд	1	0	0	1
40.	Індыя	1	0	0	1
41.	Туніс	1	0	0	1
42.	Камерун	1	0	0	1
43.	Панама	1	0	0	1
44.	Венгрыя	0	4	1	5
45.	Швецыя	0	3	0	3
46.	Турцыя	0	2	1	3
47.	Аўстрыя	0	1	2	3
48.	Узбекістан	0	1	2	3
49.	Грэцыя	0	1	2	3
50.	Харватыя	0	1	1	2
51.	Алжыр	0	1	1	2
52.	Калумбія	0	1	1	2
53.	Кіргізія	0	1	1	2
54.	Сербія	0	1	1	2
55.	Сінгапур	0	1	0	1
56.	Чылі	0	1	0	1
57.	В'етнам	0	1	0	1
58.	Эквадор	0	1	0	1
59.	Эстонія	0	1	0	1
60	Трынідад і Табага	0	1	0	1
61.	Малайзія	0	1	0	1
62.	Партугалія	0	1	0	1
63.	ПАР	0	1	0	1
64.	Арменія	0	0	5	5
65.	Тайвань	0	0	2	2
66.	Аргенціна	0	0	1	1
67.	Егіпет	0	0	1	1
68.	Літва	0	0	1	1
69.	Марока	0	0	1	1
70.	Мексіка	0	0	1	1
71.	Таджыкістан	0	0	1	1
72.	Тога	0	0	1	1

Па стану на 18.00 18 жніўня.

ПЫТАННЕ — АДКАЗ

ПЕРАМОЖАМ РАК

На любыя вашы пытанні, звязаныя з узнікненнем, дыягностыкай і лячэннем дабраякасных і злаякасных пухлін рознай лакалізацыі гатовы адказаць галоўны ўрач Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансэра Зігмунд Эдуардавіч ГЕДРЭВІЧ.

Пытанні можна пакінуць па нумары 8 (017) 287 18 29. Адказ можна будзе атрымаць непасрэдна праз публікацыю ў газеце «Звязда». Пакідайце свае пытанні да 26 жніўня.

Самы «сонечны» горад

Давыд-Гарадок можна назваць самым сонечным горадам не толькі брэсцкага Палесся — усёй краіны. Падставай для такога меркавання з'яўляюцца болей за паўтысячы гарадскіх дамоў, франтоны якіх упрыгожаны традыцыйнымі «сонейкамі». Таму карэнны жыхар Давыд-Гарадка Іван Цяцюра (на фотаздымку) свой новы дом таксама аздобіў гэтым сімвалам. Здымак быў зроблены ў мінулую суботу, калі ад спякоты зашкальвалі тэрмометры. На адным з іх (дарэчы, у цені) было зафіксавана 39 з паловаю градусаў цяпла.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Рэкордная цеплыня ўжо мінула?

У СУБОТУ Ў ЛЕЛЬЧЫЦАХ БЫЛО ЗАФІКСАВАНА ПЛЮС 38

На гэтым тыдні чакаецца ўмерана цёплае летняе надвор'е, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Дзмітрый Рабаў.

У першай палове тыдня да нас завітае антыцыклон з поўдня Еўропы, таму ападкаў не будзе. Толькі ў сераду па захадзе Брэсцкай і Гродзенскай абласцей пройдуць кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Тэмпература паветра ўначы 10—17, удзень 22—27, у сераду па паўднёвым захадзе — да плюс 31 градуса.

У чацвер — пятніцу да нас завітаюць цыклоны з Атлантыкі, якія прынясуць кароткачасовыя навальнічныя дажджы. Тэмпература паветра ўначы ад 10 па поўначы да плюс 19 — па поўдні краіны. Удзень будзе 20—27 цяпла.

Згодна з папярэднімі прагнозамі, у выхадныя пахаладае. Нявызначаны і ўстойлівае, часам дажджлівае надвор'е завітае да нас са Скандынавіі. Тэмпература паветра ўначы 8—15, удзень ад 17—19 градусаў па поўначы да плюс 24—26 градусаў па поўдні краіны.

Айчынныя сіноптыкі паведамілі, што ў мінулую суботу былі зафіксаваны тэмпературныя максімумы за 100 гадоў на дату 16 жніўня амаль на ўсіх метэастанцыях Беларусі. Максімальная тэмпература паветра ў гэты дзень склала ад плюс 29 градусаў у Езярышчы, што на поўначы Віцебскай вобласці, да плюс 38 градусаў у Лельчыцах (поўдзень Гомельскай вобласці). У Мінску 16 жніўня рэкорд цеплыні склаў плюс 34 (раней было 31,3 градуса ў 1954 годзе).

Сяргей КУРКАЧ.

Пасля ўкусу алкаголь — ні ў якім разе!

Не бывае такога года, калі б людзі не пацярпелі ад укусаў пчол, вос ці шэршняў. Іншая справа, гібель авяроў ў такім выпадку.

Такія здарэнні не з'яўляюцца насамрэч чымсьці невытлумачальным. Ёсць людзі з алергічнай рэакцыяй на яд насякомых. Як правіла, яны ведаюць аб сваёй праблеме і вытрымліваюць пэўныя правілы засцярогі. Вядома ж, алергічная рэакцыя можа калі-небудзь напаткаць і ўпершыню. У любым выпадку чалавеку заўсёды трэба быць напагатове, у прыватнасці, як мага хутчэй прамыць месца ўкусу і прымацаваць антыгістамінны, супрацьалергенны прэпарат — той жа супрасцін або тавігіл. Але ні ў якім разе, паведамляюць у Цэнтры па біярэсурсах НАН Беларусі, як параіла адна з беларускіх газет, нельга ўжываць у «пашкоджаным» стане алкаголь! Гэта можа справакаваць незваротныя наступствы, аднаазначна пагоршыць стан пацярпелага.

Святлана БАРЫСЕНКА.

На Гомельшчыне — 490 тысячнікаў!

Камбайнераў і вадзіцеляў, якія перавозяць з палёў збожжа. Не паверыўшы ў такую вялікую лічбу, я яшчэ раз патэлефанаваў у абласную арганізацыю прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу, але там пацвердзілі яе праўдзівасць. І ўдакладнілі: 230 камбайнераў і 260 вадзіцеляў з гаспадарак розных раёнаў.

Першынство ж па-ранейшаму ў экіпажа Валянціна Саламахі і Аляксандра Граня з КСУПа «Агракамбінат «Холмеч» Рэчыцкага раёна. Як захапілі яны лідарства на камбайне «Лёксіен-600» у самым пачатку жніва, так нікому і не саступаюць яго. На ўчарашні дзень на іхнім рахунку 5217 тон намалочанага збожжа.

Бліжэйшыя канкурэнты — экіпаж Мікалая Герыловіча і Сяргея Лявоненкі з філіяла «Савецкая Беларусь» адкрытага акцыянернага таварыства «Рэчыцкі камбінат хлебапрадуктаў» маюць на камбайне «КЗС-10К» такія здабыткі — 2338 тон. А сярод маладзёжных экіпажаў першынство ўтрымліваюць Максім Шаўчук і Яўген Некрашэвіч з КСУПа «Саўгас Камінтэрн» Буда-Кашалёўскага раёна (2719 тон на «КЗС-1218»).

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Увага! «Прамая лінія»

Пенсійная тэма. Якія праблемы?

Асаблівасці вызначэння стажу, разлік індывідуальнага каэфіцыента, датэрміновы выхад на пенсію, змяненні ў заканадаўстве — аб гэтым і іншым мы прапануем пагутарыць падчас «прамой лініі» з удзелам **намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Валянціны Вікенцьеўны КАРАЛЁВАЙ.**

«Прамая лінія» пройдзе **сёння з 11 да 12 гадзін** па рэдакцыйных тэлефонах: (8 017) 292 38 92 і 292 38 21.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ



РАСІЙСКІЯ ВАЙСКОЎЦЫ ПАЧАЛІ ВЫХОДЗІЦЬ З ЦХІНВАЛІ

Узброеныя сілы РФ пачалі пакідаць Цхінвалі 18 жніўня. Расійская ваенная тэхніка невялікімі групамі па пяць-дзесяць машын рухалася з паўднёваасяцінскай сталіцы ў бок Уладзікаўказа.

У прыватнасці, у бок расійскай мяжы накіраваліся сістэмы ППА «Аса» і аўтамабілі з вайскоўцамі. Як паведаміў агенцтву адзін са старшых афіцэраў, вывад расійскіх войскаў, верагодна, зойме некалькі дзён. Напярэдадні прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў заявіў, што вывад расійскіх войскаў з грузіна-асяцінскай мяжы пачнецца ў панядзелак, 18 жніўня. Паводле слоў прэзідэнта, міратворцы і падраздзяленні 58-й арміі зоймуць пазіцыі, вызначаныя ў 1999 годзе рашэннем Змяшанай кантрольнай камісіі па ўрэгуляванні грузіна-асяцінскага канфлікту.

РАСІЙСКІЯ ЧЭРГІ — САМЫЯ ДОЎГІЯ Ў ЕЎРОПЕ

Чэргі ў расійскіх супермаркетах, банках і транспартных кампаніях аказаліся самымі доўгімі ў Еўропе. Аб гэтым сведчаць вынікі даследавання, праведзенага ў 24 краінах Еўропы.

Сярэдні час абслугоўвання аднаго пакупніка ў Расіі складае тры хвіліны. У Ірландыі і Швецыі гэты паказчык складае 0,9 хвіліны, у Вялікабрытаніі і Іспаніі — 1,2 хвіліны, у Францыі — 1,83 хвіліны. Доля крамаў, дзе пакупнікі былі незадаволеныя чэргамі, у Расіі дасягае 17,6 працэнта. У Латвіі гэты паказчык складае 38,5 працэнта, пры тым што кожны пакупнік абслугоўваецца ў сярэднім за 1,1 хвіліны. Акрамя таго, абслуговы персанал расійскіх крамаў аказаўся адным з самых няветлівых у Еўропе. Доля супрацоўнікаў, гатовых дапамагчы кліентам, складае ў Расіі 41,8 працэнта. У Бельгіі — 97,8 працэнта. Толькі ў 54,9 працэнта крамаў у РФ вітаюць пакупнікоў. У Харватыі гэты паказчык складае 100 працэнтаў.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.08.2008 г.

1 долар ЗША	2 111,00
1 еўра	3 110,98
1 латвійскі лат	4 425,58
1 літоўскі літ	900,96
1 фунт стэрлінгаў	3940,39
1 польскі злоты	933,66
1 расійскі рубель	86,20
1 украінская грыўня	457,92
1 шведская крона	332,84
1 швейцарскі франк	1 926,89

Предложение заверено «12» августа 2008 года
Директор Департамента по ценным бумагам
Министерства финансов Республики Беларусь
А.Л. Гальперин

Предложение о покупке акций «Приорбанк» ОАО

Raiffeisen International Bank Holding AG (Райффайзен Интернешнл Банк Холдинг АГ) объявляет о намерении приобрести акции «Приорбанк» ОАО.

Условия предложения:

1. Покупатель – Raiffeisen International Bank Holding AG Austria, A-1030, Vienna, AM Stadtpark, 9 (Райффайзен Интернешнл Банк Холдинг АГ, Республика Австрия, А-1030, Вена, ул. АМ Штадтпарк, 9).

2. Эмитент акций – «Приорбанк» Открытое Акционерное общество, РБ, г. Минск, 220002, ул. В. Хоружей, 31А.

3. Цена приобретения:
- 9739 (Девять тысяч семьсот тридцать девять) белорусских рублей за одну простую обыкновенную акцию;
- 9739 (Девять тысяч семьсот тридцать девять) белорусских рублей за одну привилегированную акцию.

Цена приобретения является единой для всех предложенных акций.

4. Срок, форма и порядок оплаты – безналичное перечисление на счет профессионального участника рынка ценных бумаг – брокера, представляющего продавца в день заключения сделки.

5. Адрес, по которому заключаются договоры купли-продажи – г. Минск, ул. Сурганова, д. 48а (ОАО «Белорусская Валютно-Фондовая Биржа»).

6. Начало покупки (заключения договоров купли-продажи) акций: со дня публикации Предложения о покупке акций в газете «Звязда»;

окончание покупки (заключения договоров купли-продажи) акций: после истечения 30 (тридцати) календарных дней со дня начала покупки, включая день начала покупки.

Райффайзен Интернешнл Банк Холдинг АГ
Доверенное лицо В.В. Александрович

СХФ «Братково» ОАО «Копыльский райагросервис» Копыльского района Минской области

ПРИГЛАШАЕТ НА РАБОТУ

БРИГАДУ СТРОИТЕЛЕЙ.

Жилье предоставляется.

Контактные телефоны: 8 (01719) 51 7 00, 47 6 31, 47 6 43, моб. 8 (029) МТС 8710366; Velcom 1260837.

УНП 601065343

Минский городской центр недвижимости

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ
19 сентября 2008 года

Открытое акционерное общество «МАПИД» (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (Организатор аукциона) проводят открытый аукцион по продаже квартир без отделки в доме № 26 по ул. Бельского в г. Минске

№ лота	Наименование объекта				Площадь, кв.м		Начальная цена, руб.	Размер задатка, руб.
	№ квартиры	количество комнат	этаж	подъезд	общая	жилая		
1	29	1	1	2	47,5	22,4	95 500 000	9 550 000
2	30	2	1	2	65,7	35,6	132 100 000	13 210 000
3	32	1	2	2	47,5	22,6	95 500 000	9 550 000
4	33	3	2	2	91,3	50,7	183 600 000	18 360 000
5	34	2	2	2	78,3	41,6	157 400 000	15 740 000
6	35	3	2	2	91,4	55,3	183 800 000	18 380 000
7	36	1	3	2	47,5	22,6	95 500 000	9 550 000
8	37	3	3	2	90,8	50,3	182 600 000	18 260 000
9	38	2	3	2	78,1	41,7	157 000 000	15 700 000
10	39	3	3	2	91,8	55,4	184 600 000	18 460 000
11	40	1	4	2	47,5	22,5	95 500 000	9 550 000
12	41	3	4	2	90,9	50,4	182 800 000	18 280 000
13	42	2	4	2	78,4	41,8	157 600 000	15 760 000
14	43	3	4	2	91,6	55,4	184 200 000	18 420 000
15	44	1	5	2	47,4	22,4	95 300 000	9 530 000
16	45	3	5	2	91,1	50,4	183 200 000	18 320 000
17	46	2	5	2	78,0	41,5	156 800 000	15 680 000
18	47	3	5	2	91,2	55,3	183 400 000	18 340 000
19	48	1	6	2	47,5	22,6	95 500 000	9 550 000
20	49	3	6	2	91,4	50,4	183 800 000	18 380 000
21	50	2	6	2	78,3	41,6	157 400 000	15 740 000
22	51	3	6	2	91,7	55,7	184 400 000	18 440 000
23	52	1	7	2	47,6	22,7	95 700 000	9 570 000
24	53	3	7	2	91,2	50,4	183 400 000	18 340 000
25	54	2	7	2	78,3	41,8	157 400 000	15 740 000
26	55	3	7	2	91,3	55,4	183 600 000	18 360 000
27	56	1	8	2	47,6	22,6	95 700 000	9 570 000
28	57	3	8	2	91,3	50,5	183 600 000	18 360 000
29	58	2	8	2	78,4	41,8	157 600 000	15 760 000
30	59	3	8	2	91,3	55,2	183 600 000	18 360 000

1) Аукцион состоится 19 сентября 2008 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 5 (КЗ «Минск», 4-й этаж, малый зал, ауд. 410), регистрация участников — в 10.00.

2) К участию в аукционе допускаются физические лица — граждане Республики Беларусь.

3) Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы в УП «Минский городской центр недвижимости»: заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с объектом; соглашение о правах и обязанностях сторон; ксерокопию паспорта; заверенные банком копии платежных поручений подтверждающих внесение: а) задатка в сумме 10 % начальной цены; б) платы за регистрацию в размере 1/4 минимальной заработной платы.

Оплата осуществляется по безналичному расчету в белорусских рублях на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО БПС-Банк по Минской области, код 153001331, УНП 190398583.

Квартиры продаются только для использования под жилье. Граждане, выигравшие торги, обязаны вступить в товарищество собственников. Договор купли-продажи квартир с гражданами должен быть нотариально удостоверен и зарегистрирован в Республиканском унитарном предприятии «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру». Расходы, связанные с совершением нотариальных действий и государственной регистрацией договора купли-продажи и основанного на нем перехода права собственности оплачиваются победителем аукциона.

Задаток возвращается всем участникам аукциона, кроме участников аукциона, выигравших торги, в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона или с момента регистрации организатором аукциона отказа от участия в аукционе.

Участнику аукциона, выигравшему торги, задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах.

При подаче документов на участие в аукционе физическое лицо предъявляет паспорт, его представитель — паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально.

Все участники аукциона перед подачей заявления на участие в торгах должны детально ознакомиться с утвержденными Условиями проведения аукциона и объектом.

Оплата стоимости приобретенных на аукционе квартир осуществляется в установленном для физических лиц порядке по безналичному расчету в белорусских рублях в течение 25 календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона на расчетный счет продавца. Договор купли-продажи квартир подписывается в течение 14 календарных дней со дня внесения победителем полной оплаты за квартиру.

Победитель аукциона помимо оплаты за объект обязан в сроки, указанные в протоколе о его результатах, произвести оплату услуг организатору аукциона сверх цены продажи в размере 1 % от окончательной стоимости квартиры.

Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются с 20 августа 2008 г. по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6 в понедельник – четверг с 8.45 до 18.00, в пятницу с 8.45 до 16.45 по 18 сентября 2008 г. до 17.00 включительно. Телефон для справок: 227 40 22. Интернет: www.mgcn.by. Осмотр квартир проводится с 20 августа 2008 г. по вторникам и четвергам в присутствии сотрудников МАПИД с 14.00 до 16.00 по адресу: ул. Бельского, 26. Телефоны для справок: 207 19 15; 208 58 12.

УНП 190398583

Аляксандр Лукашэнка і Дзмітрый Мядзведзеў абмяркуюць актуальныя пытанні беларуска-расійскіх адносінаў

Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка знаходзіцца з рабочым візітам у Сочы, дзе на 19 жніўня запланавана яго сустрэча з Прэзідэнтам Расіі Дзмітрыем Мядзведзевым. У ходзе перагавораў плануецца абмеркаваць шырокае кола актуальных пытанняў двухбаковых беларуска-расійскіх адносінаў, а таксама пытанні міжнароднай бяспекі.

Калектыву Белпрамбудбанка аб'яўлена Падзяка Прэзідэнта Беларусі

За значны ўклад у развіццё банкаўскай сістэмы, вырашэнне задач эканамічнага развіцця краіны і ў сувязі з 85-годдзем з дня заснавання калектыву работнікаў адкрытага акцыянернага таварыства «Белпрамбудбанк» аб'яўлена Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Адпаведнае распараджэнне 15 жніўня падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

У базіраванні элементаў ПРА ва Усходняй Еўропе аб'ектыўнай неабходнасці няма

Гэта адзначыла, адказваючы на пытанне карэспандэнта БЕЛТА, намеснік начальніка ўпраўлення інфармацыі МЗС Беларусі Марыя Ваньшына ў сувязі з паведамленнямі аб парафіраванні пагаднення паміж Польшчай і ЗША аб разгортванні сістэмы ПРА на польскай тэрыторыі. «Беларускі бок неаднаразова публічна агучваў сваю пазіцыю па названым пытанні, у тым ліку і на самым высокім узроўні. Мы лічым, што аб'ектыўнай неабходнасці ў базіраванні элементаў ПРА ва Усходняй Еўропе няма».

Камісія па аналізу работы банкаў будзе створана ў Дзяржсакратарыяце Савета Бяспекі

У Дзяржсакратарыяце Савета Бяспекі Беларусі будзе створана камісія, якая прааналізуе работу банкаў па розных напрамках. Адпаведнае распараджэнне аддаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка па рэзультатах даклада ўрада аб выніках работы эканомікі за першае паўгоддзе 2008 года і аб праектах прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця, бюджэту і асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі на 2009 год.

Старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Зянон Ломаць праінфармаваў Прэзідэнта аб канкрэтных прыкладах нерацыянальнага выкарыстання бюджэтных сродкаў. Паводле яго слоў, да гэтага часу не задзейнічаны ўсе рэзервы па нарошчванні даходнай часткі бюджэту. Зянон Ломаць падкрэсліў, што, нягледзячы на меры па спрашчэнні падатковай сістэмы, яна па-ранейшаму застаецца складанай, аб чым сведчыць вялікая колькасць запытаў з просьбай аб растлумачэннях у падатковыя інспекцыі.

Старшыня КДК звярнуў увагу на той факт, што Нацыянальны банк не прымае належных мераў па кантролі за рэальнымі банкаўскімі стаўкамі па спажывецкіх крэдытах. У выніку ў асобных банках рэальныя стаўкі па такіх крэдытах з улікам спадарожных камісійных плацяжоў дасягаюць 70 працэнтаў.

Ён таксама лічыць неабходным упарадкаваць выплаты па мясцовых падатках, больш жорстка кантраляваць паступленні сродкаў у інавацыйныя фонды.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Беларусь у I паўгоддзі гандлявала са 171 краінай

Тавары пастаўляліся на рынкі 128 дзяржаў, імпартавалася прадукцыя 157 краін. Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу.

Асноўнымі гандлёвымі партнёрамі Беларусі ў студзені—чэрвені былі Расія (49 працэнтаў ад усяго аб'ёму тавараабароту), Нідэрланды (9,2 працэнта), Украіна (6,9 працэнта), Германія (4,5 працэнта), Польшча (3,9 працэнта), Латвія (3,1 працэнта), Злучанае Каралеўства (2,6 працэнта), Кітай (2 працэнты), а таксама Бразілія і Італія.

Згодна з данымі Мінстата, пастаўкі беларускіх тавараў у Расію па выніках шасці месяцаў 2008 года ўзраслі на 42 працэнты да $5,58 млрд і склалі ў агульным аб'ёме экспарту рэспублікі 32,3 працэнта. Экспарт у Нідэрланды павялічыўся на 68,8 працэнта і дасягнуў $3,2 млрд (18,6 працэнта ў агульным аб'ёме), ва Украіну — у 2,6 раза да $1,5 млрд (8,7 працэнта).

У цэлым Беларусь у студзені—чэрвені гэтага года павялічыла аб'ём знешняга гандлю таварамі ў параўнанні з аналагічным перыядам 2007 года на 58,5 працэнта да $36,76 млрд. У тым ліку экспарт узрос на 61,8 працэнта да $17,273 млрд, імпарт — на 55,7 працэнта да $19,488 млрд.

Больш за 400 донараў у год для аперацый на галаўным мозгу

Згодна з законам аб трансплантацыі органаў і тканак, які дзейнічае ў нашай краіне, у тым выпадку, калі патэнцыяльны донар ці яго родзічы не супраць, медыцынская ўстанова мае права ў экстраных выпадках забіраць жыццёва неабходныя іншаму чалавеку органы і тканкі.

— Аднак да гэтага часу акрэслена норма працавала не ў дастатковай ступені, — адзначыў **намеснік начальніка аддзела па нагляду за выкананнем правоў і свабод грамадзян Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь Павел РАДЗІВОНАЎ.** — Больш за тысячу чалавек, якія пражываюць на тэрыторыі Беларусі, маюць неабходнасць у трансплантацыі нырак. Але за 2005—2007 гады было праведзена толькі крыху больш як сорак такіх аперацый.

У краінах блізкага замежжа ўзровень донарства складае ад 9 да 32 адзінак на мільён насельніцтва, у нашай жа краіне ўзровень донарства не перавышае дзвюх адзінак на мільён насельніцтва. Няўжо ў Беларусі не хапае донараў?

— Не, донараў у нас дастаткова, — запэўніў Павел Радзівонаў. — Прычына неаказання медыцынскай дапамогі насельніцтву, у тым ліку па трансплантацыі нырак, была звязана з адсутнасцю дастаткова сучасных і эфектыўных нарматыўных прававых актаў, якія б рэгулявалі ўзаемадзеянне медыцынскіх органаў па забору органаў і тканак і іх трансплантацыі пацыентам. У прыватнасці, у рэспубліцы былі вызначаны 39 медыцынскіх устаноў, якія мелі права ажыццяўляць забор трупных органаў і тканак. З гэтых 39 устаноў толькі дзве — сталічныя медыцынскія ўстановы — паведамлялі аб наяўнасці патэнцыйных донараў. Астатнія 37 медыцынскіх устаноў, нягледзячы на тое, што сотні людзей чакаюць, напрыклад, гэтай ныркі, нагогул ні разу не паведамілі ва ўпаўнаважаныя брыгады Міністэрства аховы здароўя аб наяўнасці донараў. Такая сітуацыя недапушчальная. У сувязі з гэтым Генеральнай пракуратурай былі прыняты адпаведныя акты, накіраваныя на ўстараненне дапушчаных парушэнняў. Радуе, што ў параўнанні з мінулым годам работа па трансплантацыі органаў актывізавалася. Аб гэтым сведчыць тое, што сёлета ўжо праведзена больш чым 60 аперацый па трансплантацыі нырак... Акрамя таго, у Беларусі штогод праводзіцца больш як пяць з паловай тысячы аперацый на галаўным мозгу, — дадаў Павел Радзівонаў. — Толькі для аперацый на галаўным мозгу рэспубліка можа мець больш як 400 донараў у год.

Надзея ДРЫЛА.

В БЕЛАРУСБАНКЕ ОТКРЫТ
БЛАГОТВОРИТЕЛЬНЫЙ СПЕЦИАЛЬНЫЙ СЧЕТ
для зачисления средств в пользу жертв гуманитарной катастрофы в Южной Осетии
В ОАО «АСБ Беларусбанк» открыт благотворительный специальный счет для зачисления средств в пользу жертв гуманитарной катастрофы в Южной Осетии в белорусских рублях, долларах США, евро и российских рублях — № 3642900000593, МФО 7595, УНП 100325912. Прием благотворительных взносов осуществляется во всех подразделениях банка без взимания платы за обслуживание как от юридических, так и физических лиц, в безналичной и наличной форме.
Телефоны пресс-службы ОАО «АСБ Беларусбанк»: 218 85 33, 218 85 81.

Сакратарыят Юшчанкі абвінавачвае Цімашэнку ў дзяржаўнай здрадзе

Сакратарыят прэзідэнта Украіны Віктара Юшчанкі выкрыў прэм'ер-міністра Украіны Юлію Цімашэнку ў дзяржаўнай здрадзе, паведаміў 18 жніўня «УНІАН» са спасылкай на намесніка кіраўніка сакратарыята Андрэя Кіслінскага. Паводле яго слоў, у праваахоўныя органы перададзеныя матэрыялы справы «аб прыкметах дзяржаўнай здрады і палітычнай карупцыі» ў дзеяннях прэм'ер-міністра. Паводле інфармацыі сакратарыята, расійскае кіраўніцтва паабяцала Юліі Цімашэнцы падтрымку на маючых адбыцца прэзідэнцкіх выбарах у абмен на пасіўную пазіцыю прэм'ер-міністра і яе партыі ў канфлікце паміж Расіяй і Грузіяй.

Кіслінскі таксама адзначыў, што на рэалізацыю падтрымкі Цімашэнкі расійскі бок ужо выдаткаваў каля мільярда долараў. «Праца перадвыбарнага штаба ўжо фактычна пачатая. Да яе далучаюцца ўкраінскія фінансава-прамысловыя групы», — сцвярджае намеснік кіраўніка сакратарыята ўкраінскага прэзідэнта. Нагадаем, раней Кіслінскі заяўляў, што аналітыкі сакратарыята Юшчанкі раскрылі змову Юліі Цімашэнкі з Крамлём. У прыватнасці, паведамлялася аб існаванні дамоўленасцяў адносна транспарціроўкі і рэалізацыі расійскага газу на Украіне і ў Еўропе, стрымлівання працэсу ўступлення краіны ў НАТА і выкананні расійскіх рэкамендацый у працы над праектам канстытуцыі Украіны.

ПАВЫШАНЫ РОЗНІЧНЫЯ ЦЭНЫ НА АСОБНЫЯ ВІДЫ ТЫТУНЁВЫХ ВЫРАБАЎ

Рознічныя цэны на асобныя віды тытунёвых вырабаў павышаны ў Беларусі з 14 жніўня.

Так, цэны на цыгарэты «Карона» ААТ «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» па дагаворы аб кантрактнай вытворчасці з ТАА «Тытунь-Інвест» павышаны на 1 працэнт, або на Br10 (для разлікаў за пастаўленую і рэалізуемую прадукцыю да Br943 і для рэалізацыі насельніцтву да Br990), цыгарэты Magna, Monte Carlo, West і Winston вытворчасці ТАА «Тытунь-Інвест» павялічаны на 1,1—1,6 працэнта, або на Br20.

МАЎЧАННЕ — ЗОЛАТА

Менавіта так гаворыць кітайская народная мудрасць. Не ведаю, ці ў поўнай меры яна адносілася падчас мінулых выхадных да беларускай каманды, аднак у яе скарбонку з раней вызначаных першых месцаў сыпаліся медалі самай рознай вартасці, акрамя залатых. Відаць, мы вельмі шмат гаварылі пра тое, чаго вельмі хацелася…

Пасля багатага пятнічнага «ўраджаю», калі штангіст Андрэй Рыбакоў і кідальнік ядра Андрэй Міхневіч у драматычнай барацьбе заваявалі «серабро» і «бронзу», субота здавалася самым надзейным днём у плане «адмывання» «золата». І прыскі гэтыя знаходзіліся на вяслярным канале SY Rowing-Canoeing Park. Усе нашы поэіркі былі скіраваны ў бок старту жаночай адзіночнай гонкі на 2000 метраў, дзе стартавала двухразовая алімпійская чэмпіёнка Кацярына Карстэн. На жаль, нашых жаданняў аказалася недастаткова, каб мінчанка змагла паўтарыць подзвіг Атланты-96 і Сіднэя-2000. Падвох Карстэн атрымала ад сваёй даўняй саперніцы Румяны Нейкавай. На дзвюх папярэдніх алімпіядах Румяна станавілася прызёркай, займаючы, праўда, месцы, рангам ніжэйшыя, чым Кацярына. І вось настаў час вяртаць даўгі. Так сплыла першая надзея на «золата».

Фінальны заезд жаночых лодак-двоек распашных на 2000 м, дзе стартавалі нядаўнія чэмпіёнкі свету-2007 у Мюнхене Юлія Бічык і Наталля Гелах, таксама пакідаў надзейным на вышэйшую прыступку п'едэстала для беларусак. Праўда, запознены старт даволі працяглы час стрымліваў наш экіпаж на другой пазіцыі. А ўжо на фінішы іх накацілі амерыканкі. І зноў — «бронза». Пасля такой развязкі беларускі экіпаж нават не стаў каментаваць у мікс-зоне сваё выступленне. Праўда, потым страсці крыху ўлегліся і на іх тварах нават з'явілася ўсмешка, што азначала: «бронза» — дык «бронза». Жыццё ж працягваецца.

Суботнюю вячэрнюю праграму вянчалі кідальніцы ядра, дзе з аб'ектывам відэа- і тэлеапаратараў не сыходзіла беларуска Надзея Астапчук, нядаўняя пераможца турніру серыі Гран-пры ў Стакгольме. Максімум, што атрымалася ў Астапчук у пятай спробе — кідок на 19,86 м, які ў рэшце рэшт аказаўся бронзавым. Намнога раней задачу па заваёўванні сярэбранага медаля вырашыла яшчэ адна беларуска Наталля Міхневіч. У другой спробе яна запусціла снарад на 20,28 м, чым застаўбіла за сабой «серабро». Поспеху Наталлі Міхневіч можна толькі па-добраму пазайздросціць. Яна змагла дасягнуць такой алімпійскай вышыні праз год пасля нараджэння сына.

Субота аказалася не зусім удалым днём для многіх беларускіх атлетаў у іншых дысцыплінах. Прадстаўнікі спартыўнай хадзьбы на 20 км Сяргей Чарноў, Дзяніс Сімакоў і Іван Троцкі занялі адпаведна 44-е, 28-е і 22-е месцы. Стэндавы стралок Андрэй Герашчанка закончыў сваё выступленне на 34-й пазіцыі. Дэбютантка спаборніцтваў такога рангу сяміборка Яна Максімава фінішавала на 6-м месцы. Пэўныя надзеі на адзін з медалёў ускладваліся на чэмпіёна свету веласіпедыста Васіля Кірыенку. Аднак у гонцы па ачках беларус не змог праявіць свае лепшыя якасці, у выніку фінішаваў 5-м...

У нядзелю, здавалася, сам бог загадваў беларусам адкрыць лік залатым медалям. Як-ніяк у бой уступала цяжкая артылерыя ў асобах трохразовага чэмпіёна свету Івана Ціхана і яго пастаяннага калегі-саперніка Вадзіма Дзевятоўскага. Але... Славенец Космус ужо ў другой спробе афарміў сабе чэмпіёнства (82,02 м), а нашы малатабойцы Дзевятоўскі (81,61 м) і Ціхан (81,51 м) склалі яму кампанію на п'едэстале.

У фінальным заплыве на 50 м вольным стылем выступала беларуска Аляксандра Герасіменя. Яна замкнула васьмёрку.

Мог прыпаднесці сюрпрыз у стральбе з малакалібернай вінтоўкі (50 м, тры пазіцыі) Сяргей Мартынаў, які з першых выстралаў ішоў у групе лідараў. Праўда, перадапошнюю і апошнюю серыі мінчанін праваліў і заняў выніковае 34-е месца, прапусціўшы наперад свайго калегу Віталя Бубновіча (29-е месца). Адзін з медалёў высвечваўся ў камандным першынстве сярод шаблістаў. Праўда, тры беларусаў у асобах Валерыя Прыёмкі, Дзмітрыя Лапкеса і Аляксандра Буйкевіча не змагло справіцца з выступленнем-спектаклем італьянцаў, якім бы ў тэатры фехтаваць, а не на Алімпіядзе, і выбыла на шляху да пераможнага фінішу. Прайграўшы па ачках — 39:45. Крыху пазней беларусы ў барацьбе за 5-е месца разгромілі егіпцян.

Першая схватка прадстаўніцы Беларусі па вольнай барацьбе Вольгі Хілько стала і апошняй — яна ўступіла 0:5 польскай спартсменцы Моніцы Міхалік. Толькі праз суцяшальны заезд змагла прабіцца ў чвэрцьфінал жаночага спрынту наша славутая трэк-веласіпедыстка Наталля Цылінская. Імгненне не хапіцца для праходу ў фінальны забег на 100 м нашай алімпійскай чэмпіёнцы Афін Юліі Несцярэнцы. З вынікам 11,26 у пяўфінале яна заняла 5-е месца і вымушана была сысці з дыстанцыі. Прайграла апошні кваліфікацыйны матч супраць бразіліянак наша баскетбольная каманда. Праўда, гэты паядынак ужо нічога не вырашыў: падначаленыя Анатоля Буяльскага датэрмінова прабіліся ў чвэрцьфінал, дзе сёння ў 9.30 па беларускім часе іх саперніцамі будуць кітаянкі.

Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ, сярэбраны прызёр Алімпіяды ў Пекіне ў кіданні молата:

«Я АДЧУВАЮ, ШТО АПОШНЯЯ СПРОБА ПРЫНЕСЛА Б МНЕ «ЗОЛАТА»...»

Двухразовы пераможца этапаў Гран-пры ў Осака змог унесці інтрыгу ў сектар для кідання молата і да апошняга трымаў у напружанні ўвесь стадыён.

— Вадзім, «серабро» Пекіна для цябе — гэта мяжа мараў?

— Не сказаў бы, бо хто адмовіцца ад тытула алімпійскага чэмпіёна? Тым не менш лічу, што другое месца на цяперашняй Алімпіядзе — гэта псіхалагічны прарыў, але не задавальненне. Мая гатоўнасць была намнога вышэйшай. Я адчуваю, што апошняя спроба прынесла б мне «золата», але ж молат выбраў сетку...

— Пасля заканчэння спаборніцтваў ты так спрытна накрыў славенца Прымажа Козмуса беларускім сцягам і зрабіў з ім круг гонару, што цяжка было сказаць, хто з вас атрымаў перамогу?

— А чаго было саромецца?! Я ведаю Козмуса ўжо даўно. Ды і грэх было не «засвяціць» наш беларускі сцяг перад шматтысячнай аўдыторыяй. Як-ніяк, а мы з Іванам стараліся, як маглі, і заслужылі, каб Беларусь у свеце ведалі яшчэ больш.

— Зрэшты, для цябе важна выйграць менавіта ў Ціхана?

— Не, безумоўна. У сектары для кідання молата я заўсёды змагаюся ў першую чаргу з сабой.

— Адчувалася, што ў цябе яшчэ ёсць сілы. Сказалася добрая акліматызацыя?

— І гэта таксама. Я вельмі часта выступаю ў Японіі, дзе ўмовы надвор'я вельмі падобныя на пекінскія. Таму ведаю, што ў такое пекла лепш прыязджаць за дзень да стартаў. А на трэці дзень ужо назіраецца пад'ём сілаў.

Наталля МІХНЕВІЧ, сярэбраны прызёр Алімпіяды ў Пекіне ў штурханні ядра:

«Я ЗАДАВОЛЕНАЯ СВАІМ ВЫНІКАМ»

Выступленне на Алімпійскіх гульнях Наталлі Міхневіч у Пекіне можна лічыць трыумфальным ужо толькі за тое, што спартсменка змагла пасля даволі працяглага перыяду, звязанага з нараджэннем дзіцяці, не толькі аднавіць свае сілы, але і зрабіць значны крок на алімпійскай ніве.

— Наташа, як ацэньваеш сваё вяртанне ў вялікі спорт?

— А як вы думаеце? Я вельмі задаволеная сваім вынікам (20,28 м) і асабліва сярэбраным медалём.

— А думкі дабрацца да «золата» не было?

— Які ж атлет не марыць стаць алімпійскім чэмпіёнам?

— Поспех твайго мужа Андрэя цябе натхніў на вялікія справы?

— А як жа. Падтрымка блізкага чалавека — гэта тое, што трэба ў такія моманты. Ведаеце, я знутры адчувала, як за мяне хварэюць мае родныя, блізкія, трэнеры, і гэта надавала мне сілы.

— Сямейную перамогу будзеце неяк адзначаць?

— Думаю, што гэта будзе лепей зрабіць у Мінску, у коле знаёмых і сяброў. Праўда, без лішняй пампезнасці. Як-ніяк, а наш сезон на Алімпійскіх гульнях не заканчваецца. Таму трэба думаць наперад, як падтрымліваць сябе ў добрай спартыўнай форме. Для мяне гэта цяпер вельмі важна — трэба ж высока трымаць марку сярэбранага алімпійскага прызёра.

Надзея АСТАПЧУК, бронзавы прызёр Алімпіяды ў Пекіне ў штурханні ядра:

«МАГЛО БЫЦЬ І ГОРШ»

Імя беларускай спартсменкі Надзі Астапчук добра вядомае ў знаўцаў лёгкай атлетыкі ўсяго свету. Праўда, свае перамогі ў сектары для штурхання ядра мінчанка здабывала на міжнародных спаборніцтвах самага высокага рангу, акрамя алімпійскіх. На Гульнях у Афінах у яе быў чацвёрты вынік. І вось — бронза Пекіна.

— З алімпійскім медальным пачынам!

— Дзякуй. Я вельмі рада, што мне ўдалося заваяваць бронзу.

— Што з'явілася перашкодай для чэмпіёнкі свету-2005 і ўладальніцы сярэбранага медаля на сусветным першынстве-2007 у Осака пазмагацца за першае месца?

— Я належным чынам не паспела акліматызавацца — ад таго самаадчуванне было не самым лепшым. Да таго ж у мяне пачало зводзіць нагу. Таму давялося штурхаць снарад на прамой назе.

— Значыць, магло быць і горш?

— Магло. Паглядзіце, якія шчыльныя вынікі зараз паказваюць спартсменкі, якія ўвайшлі ў фінальную васьмёрку. Практычна кожная з іх магла кінуць снарад за 19 метраў.

Андрэй МІХНЕВІЧ, бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў у Пекіне ў штурханні ядра:

«АЛІМПІЙСКАЯ ЎЗНАГАРОДА ЛЮБОЙ ВАРТАСЦІ — ГЭТА ВЯЛІКАЯ ПЕРАМОГА КОЖНАГА СПАРТСМЕНА»

Выступленні Андрэя Міхневіча ў сектары для кідання ядра заўсёды вызначаюцца пэўнай экспрэсіўнасцю атлета, з-за чаго ён адразу завалёўвае сімпатыі гледачоў. Сёлетні паказ алімпійскай «моды» на ядро ў Пекіне прынёс мінчаніну, чэмпіёну свету-2003 у Парыжы, бронзавы медаль (21,05 м).

— Андрэй, напэўна, хацелася ўзнагароды больш высокай вартасці? Крыўдна, што амерыканец Крысцьян Кантвел абышоў цябе толькі на 4 сантыметры?

— Давайце не будзем забываць, што канадзец Дзілан Армстронг спыніўся за мной усяго ў адным сантыметры. Так што я задаволены, што ў такой канкурэнцыі змог падняцца на п'едэстал. Бо фінальны турнір ішоў у адпаведнасці з прынцыпам: пан ці прапаў.

— Можна сцвярджаць, што бронзавы медаль для Андрэя Міхневіча — гэта поспех?

— Ведаеце, любы алімпійскі медаль — гэта вялікі крок наперад. Гэта — перамога.

— Чатыры гады таму, адразу пасля трыумфальнага выступлення на чэмпіянаце свету ў Парыжы, ты аказаўся толькі пятым. Што з таго часу змянілася ў штурханні ядра?

— Давайце адразу падкрэслім, што сусветнае першынство і Алімпійскія гульні — гэта зусім розныя спаборніцтвы. Таму не факт, што дзеючы чэмпіён свету можна трапіць нават у прызавую тройку на Алімпіядзе. А наконт магчымых змяненняў у штурханні ядра скажу, што кардынальна нічога. Змяняюцца хіба толькі спартсмены, і тое з гадамі. А так усё застаецца ранейшым: барацьба псіхікі, раскрыццё ўнутраных рэзерваў. Плюс, безумоўна, своечасовая адаптацыя да мясцовых кліматычных умоў.

— Напэўна, важнай была падтрымка тваёй жонкі Наталлі, якая днём пазней заваявала ў гэтым жа раздзеле жаночай праграмы «серабро»?

— Безумоўна, падтрымка блізкага чалавека як нішто іншае настройвае цябе на станоўчы лад, дадае нейкую дынаміку ў выступленні.

— А твая заслуга ў яе сярэбраным поспеху ёсць?

— Пэўна, ёсць, бо я таксама думкамі быў у сектары з ёй. Хоць, пагадзіцеся, што ёй было цяжэй, чым мне. Наталля хвалявалася за мяне перад тым, як выступаць.

— Напярэдадні Алімпіяды ў Пекіне хадзіла шмат чутак наконт таго, што Наталля Міхневіч пасля нараджэння сына наўрад ці ў сцісłыя тэрміны зможа прыступіць да трэніровак і набраць неабходную форму?

— Людзям жа языкі не завяжаш. Безумоўна, у такім выпадку чалавеку лепш бы сказаць пару-другую камплімentаў, падтрымаць маральна, а не травіць душу. Таму я бясконца рады за жонку, што яна змагла паказаць сябе як сапраўдны баец на галоўных стартах.

Кацярына КАРСТЭН, бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў у Пекіне ў акадэмічным веславанні:

«Я АДДАЛА ЎСЕ СІЛЫ, ШТО Ў МЯНЕ СЁННЯ БЫЛІ»

Роля Кацярыны Карстэн у фарміраванні залатога фонду беларускай каманды заўсёды была важнай. Праўда, на папярэдніх Гульнях у Афінах Каці дасталася серабро, таму выступленне беларускай спартсменкі ў фінальным заездзе (2000 м) на канале ў Пекіне чакалі з вялікай надзеяй на вяртанне першага месца. На жаль, ёй не ўдалося вярнуць сабе чэмпіёнскі тытул. Яна заваявала бронзу з розніцай крышку больш за секунду прапусціўшы наперад амерыканку Мішэль Гуерэт і балгарку Румяну Нейкаву.

— Каця, якія вашы ўражанні ад гонкі?

— Я аддала для яе перамогі ўсе сілы, што ў мяне былі, але ж гэтага аказалася мала. Відаць, сёння быў не мой дзень. Але ж і бронзавы алімпійскі медаль, лічу, гэта вялікая ўдача.

— Да гэтага заезду на міжнародных спаборніцтвах вы не прайгравалі больш за тры гады...

— Так, пачынаючы з 2005 года, я выйграла ўсе этапы Кубака свету, чэмпіянаты свету. Таму, згадзіцеся, крыўдна прайграваць на адзіным у сезоне старце. Але ж нездарма кажуць, што Алімпіяда — гэта асобныя старты, якія ні на што не падобныя.

— Румяна нядаўна заявіла, што яна працягне свае выступленні ў спорце і мэтанакіравана будзе рыхтавацца да наступнай Алімпіяды ў Лондане. Вы ж практычна аднагодкі.

— Да таго ж балгарка мая даўняя знаёмая і вельмі добры чалавек. Так і напішыце: калі Румяна будзе рыхтавацца да Алімпіяды-2012, то і Карстэн таксама зробіць усё магчымае, каб быць у добрай форме ў бліжэйшыя чатыры гады. Адчуваю, што для гэтага ў мяне яшчэ ёсць сілы.

Наталля ГЕЛАХ і Юлія БІЧЫК, уладальніцы бронзавых медалёў у Пекіне ў акадэмічным веславанні:

«МЫ ЯШЧЭ ПАВАЮЕМ»

Фінальны заезд (2000 м) беларускага дуэта вяслярак — двойкі распашной Наталлі Гелах і Юліі Бічык чакаўся на канале SY Rowing-Canoeing Park з вялікай надзеяй на першае месца. Як-ніяк, а гэтая пара — мінулагоднія чэмпіёнкі свету ў Мюнхене і неаднаразовыя прызёры сусветных першынстваў і Алімпійскіх гульняў у Афінах.

Пасля заканчэння гонкі дзяўчаты выглядалі вельмі раздражнёнымі і на размову з прэсай згадзіліся не адразу. Крыўдна ўсё ж прайграць сярэбраныя медалі кітайскай пары з розніцай усяго ў 0,63 секунды (у ролі «адказчыка» выступала Юлія Бічык).

— Паказалася, што вы крышку «праспалі» на старце, у выніку чаго румынкі Жаржэта Андрунашэ і Віорыя Сузану адразу захапілі лідарства, якое не аддалі да канца гонкі?

— Мы з самага пачатку разлічвалі на такі тэмп, таму гаварыць, што засядзеліся, наўрад ці можна.

— Што можаце сказаць пра вашых саперніц? Кітаянкі тут усюды вылазяць як чорт з табакеркі, хоць апошнюю чвэрць дыстанцыі яны праплылі хутчэй за ўсіх — 1:45,93 сек. Румынкі ж традыцыйна моцныя ў акадэмічным веславанні?

— Тое, што прадстаўнікі Паднябеснай тут на ўсе рукі майстры, мы ўпэўніліся. Тым не менш кітайская двойка, якая нас накаціла на апошніх метрах дыстанцыі — вельмі вопытныя саперніцы. Сёлета яны некалькі разоў выйгравалі этапы Кубка свету. Што датычыцца румынак, то шапкамі іх не закідаць. Тая ж Жаржэта Андрунашэ — трохразовая алімпійская чэмпіёнка ў пары і двухразовая — у адзіночным веславанні. Вядома ж, мы ні ў якім разе не павінны ківаць на тытулы саперніцкіх. Уступілі — значыць, нешта не так зрабілі, як трэба. Магчыма, трэба было па ходу гонкі пераўладкавацца на іншы, больш хуткі тэмп веславання. Але ж чаго цяпер галаву пасыпаць попелам: бронзавы медаль — гэта таксама вялікі поспех. Тым больш алімпійская ўзнагарода, якой бы вартасці яна ні была — гэта мара многіх спартсменаў. Таму ўзнагароду пекінскага ўзору можна лічыць як поспех.

— Сілы ёсць надалей выступаць?

— Скажу так: мы яшчэ паваюем. Чалавек жа па прыродзе сваёй павінен ісці наперад і дабівацца вынікаў, як бы цяжка яму пры гэтым ні было.

Іван ЦІХАН, бронзавы прызёр Алімпіяды ў Пекіне ў кіданні молата:

«Я МАРУ ВЫЙГРАЦЬ ЗАЛАТЫ АЛІМПІЙСКІ МЕДАЛЬ»

Беларускі волат Іван Ціхан ужо на працягу трох апошніх чэмпіянатаў свету становіцца першым. Таму ўсе яго выступленні ў балельшчыкаў асацыююцца толькі з перамогай. Праўда, з алімпіядамі ў беларуса справы ідуць не так гладка. На Гульнях-2000 у Сіднэі ў яго было 4-е месца, на Алімпіядзе ў Афінах Ціхан быў другім. І вось — бронзавы поспех.

— Іван, як ацэньваеш сваё выступленне ў Пекіне?

— Пэўна, вам відней. Я ж унутры стадыёна быў, а глядзелі зверху. А калі без жартаў, то бронза — гэта ў некаторай ступені поспех, бо спаборніцтвы на алімпіядах не ідуць ні ў якое параўнанне з іншымі турнірамі.

— Так ужо павялося, што цябе практычна заўсёды выручалі апошнія спробы.

— Цяпер не атрымалася. Думаю, што мне не хапіла нейкай свежасці.

— Магчыма, стаўку трэба было рабіць на першыя кідкі?

— Можа быць. Хоць абмяркоўваць па гарачых слядах проста. Маўляў, вось калі б так было, то я абавязкова зрабіў вось гэтак і выйграў бы спаборніцтвы ці прынёс золата на талерачцы. Так не бывае. У спорце не прымальны ўмоўны лад. Маеш тое, што ёсць. Ёсць у мяне сёння алімпійская бронза і я задаволены гэтым, бо на ўсё воля Божая. Хоць, няма чаго граху таіць: я, як і кожны спартсмен, марыў быць стаць алімпійскім чэмпіёнам.

— Пэўна, такі шанц у цябе яшчэ будзе?

— Гэта вы пра Лондан? А чаму б і не. Адчуваю ў сабе сілы выступаць і далей.

— Выступленне калегі Вадзіма Дзевятоўскага, які «перакінуў» цябе на 10 сантыметраў, здзівіла?

— Я заўсёды ведаў, што Вадзім добры спартсмен і гатовы ў любую хвіліну сабрацца. Таму вельмі рады, што яму ўдалося выйграць «серабро».

— Што далей, якія планы?

— Адкажу па-філасофску: прыняць дастойна тое, што ёсць, і ісці працаваць далей.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ, *г. Пекін.* **Фота БЕЛТА.**

Абзац

■ Праваахоўныя органы Оршы высвятляюць абставіны пажару ў складскім памяшканні на тэрыторыі гаспадарчай часткі станцыі «Орша», у выніку якога пашкоджаны расійскі электрацягнік. Аднапавярховы будынак належаў прыватнай асобе і выкарыстоўваўся для захоўвання будматэрыялаў. У ліквідацыі наступстваў здарэння ўдзельнічалі 4 аддзяленні Аршанскага гар(рай)аддзела па надзвычайных сітуацыях і пажарныя станцыі. Пашкоджаны дах будынка, будматэрыялы, што знаходзіліся ў ім, а таксама лакаматыў, які належыць лакаматыўнаму дэпо г. Вязьма. Магчымая прычына пажару — падпал. Вядзецца праверка, па выніках якой будзе прынята рашэнне аб узбуджэнні крымінальнай справы.

■ **У Александрыі (Егіпет) 27-гадовая егіпцянка нарадзіла семярых немаўлят — чатырох хлопчыкаў і трох дзяўчынак. Нованароджаныя, якія важаць ад 1,5 да 2,8 кг, змешчаныя ў інкубатары ў чатырох бальніцах, у якіх ёсць абсталяванне для выходжвання неданошаных дзяцей. На працягу двух гадоў дзеці будуць атрымліваць ад дзяржавы бясплатнае малако і падгузкі.**

■ Работнікі парку забаў Дыснэйлэнд у штаце Каліфорнія (ЗША), апранутыя ў касцюмы Мікі Маўса, Папялушкі і Беласнежкі, арыштаваныя за супраціўленне паліцыі падчас дэманстрацыі за паляпшэнне ўмоў працы і павышэнне зарплаты. У дэманстрацыі ўзялі ўдзел 2,3 тыс. клоунаў, кухараў, прыбіральшчыкаў і працаўнікоў гатэльнага бізнэсу. Кантракты ўсіх працаўнікоў скончыліся сёлета ў лютым, і з тоі пары ідуць перамовы паміж прафсаюзам і гаспадарамі парку.

■ **Сямейная пара была выратаваная ў Баварыі пасля таго, як яе аднаматорны самалёт завіс у лініях электрапередачы. Муж і жонка знаходзіліся ў перавернутым самалёце, які завіс у правадах 380 000 Вт на адлегласці 18 м ад зямлі непадалёк ад горада Кемптэн. Каля дзвюх гадзін чакалі яны прыбыцця пажарнай брыгады з двума перасоўнымі кранамі. Усё абышлося нармальна, аднак пара дастаўленая ў бальніцу для абследавання.**

Поўны абзац

■ **Удача ўсё ж не пакінула рабаўніка банка — знаходзячыся пад следствам за здзейсненае злачынства, ён выйграў свой мільён долараў у латарэю. Два гады таму 55-гадовы беспрацоўны з ЗША быў прыгавораны за няўдалае рабаўніцтва банка да пяці гадоў умоўнага пакарання. Умовы прысуду забаранялі яму гуляць у азартныя гульні, удзельнічаць у латарэях і наведваць гульневыя ўстановы. Асуджаны купіў білет за $10, на які прыпаў выйгрыш у мільён долараў. Суддзя дазволіў захаваць выйгрыш, палічыўшы, што ўмовы прысуду парушаны вельмі нязначна. Адзінай умовай для асуджанага стала неабходнасць аплаты штомесячнага штрафу ў $65, ад якога ён быў вызвалены ў сувязі з грашовай беднасцю.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Бацькі выжылі, Аўтатрагедыя сын памёр ад атрыманых траўмаў

**16 жніўня ў Бялыніцкім

Прамая лінія

НОВЫЯ ПРАВІЛЫ ЧАКАЮЦЬ КАМЕНТАРЫЯЎ

Вядучыя мовазнаўцы ўжо рыхтуюць тлумачэнні да новаўвядзенняў у беларускім правапісе

На традыцыйную «Прамую лінію» Беларускага радыё быў запрошаны доктар філалагічных навук, прафесар, дырэктар інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ.

— Як адбудзецца пераход да новых правілаў?

— Закон уступае ў сілу з першага верасня 2010 года, а да гэтага часу павінны дзейнічаць «Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі»1959 года. І ў гэтым сэнсе ў выкарыстанні пісьмовай мовы не павінна нічога змяніцца. Але вось гэты двухгадовы перыяд дае магчымасць падрыхтаваць базу для бесперашкоднага пераходу да новай рэдакцыі правілаў беларускай арфаграфіі. За гэты час будуць падрыхтаваны нанова ці перавыдадзены лексікаграфічныя даведнікі беларускай мовы, у першую чаргу, арфаграфічны слоўнік. На сёння найбольш аўтарытэтным даведнікам па беларускім правапісе з'яўляецца акадэмічны «Слоўнік беларускай мовы», выдадзены ў 1987 годзе. Ён даўно стаў бібліяграфічнай рэдкасцю. У нас у інстытуце ўжо фактычна падрыхтавана другое выданне гэтага слоўніка. Таму да 2010 года карыстальнікі атрымаюць новы нарматыўны даведнік, які дазволіць ім бесперашкодна карыстацца беларускай пісьмовай мовай у адпаведнасці з новай рэдакцыяй правілаў. У самы блізкі час спецыялісты інстытута падрыхтуюць каментарыі да Закона «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі», дзе будзе растлумачана кожнае правіла і пададзена характарыстыка кожнага канкрэтнага змянення. І ў гэтых каментарыях плануецца прывесці найбольш поўныя спісы слоў, якія падлягаюць зменам у адпаведнасці з новай рэдакцыяй. Увядзенне новых правілаў арфаграфіі ў дзеянне, у тым ліку і ў школьную практыку, на мой погляд, павінна прайсці абсалютна бесперашкодна, таму што тыя змены, якія ўводзяцца законам, не закранаюць асноўных прынцыпаў дзеючага правапісу. Фактычна размова ідзе толькі пра тое, каб зменшыць колькасць выключэнняў. Напрыклад, паводле новай рэдакцыі пашыраецца напісанне «ў» у словах іншамоўнага паходжання. Фактычна правіла застаецца тым жа самым, у сэнсе, што пасля галосных «у» пераходзіць у «ў». Змяншаецца толькі колькасць лексічных адзінак, якія не адпавядаюць гэтаму правілу. У не скарачаецца ў словах іншамоўнага паходжання толькі ў двух выпадках: калі словы гэтыя заканчваюцца на -ум, -ус (напрыклад: *прэзідыум, радыус*) або калі «у» знаходзіцца пад націскам (*Брэсцкая ўнія, да ўрны, аўл*). А ўсе астатнія словы будуць пісацца ў адпаведнасці з асноўнымі правіламі. І гэта абсалютна зразумела і заканамерна. Сапраўды, калі ў 1950-я гады ствараліся правілы правапісу, слова «універсітэт», напрыклад, было дастаткова незвычайным і малаўжывальным для большасці карыстальнікаў беларускай мовы. На сёння гэта моўная адзінка настолькі знаёмая і распаўсюджаная, што наадварот выклікае здзіўленне, чаму яна не павінна падпарадкоўвацца агульнаму правілу. Таму ў адпаведнасці з новай рэдакцыяй прапануецца пісаць «ва ўніверсітэце». Дарэчы, так даўно ўжо робіць газета «Звязда».

— Ці плануецца перападрыхтоўка педагогаў?

— Хоць гэта пытанне і прэрагатыва Міністэрства адукацыі, але наколькі я ведаю, зараз тэрмінова распрацоўваецца праграма ўвядзення ў дзеянне новай рэдакцыі правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі ў розныя сферы, у тым ліку і ў сферу школьнай адукацыі. Там будуць прадугледжаны канкрэтныя меры, якія дазволяць адаптавацца да новых правілаў і настаўнікам. Тым больш, што новая рэдакцыя не патрабуе абавязковага і тэрміновага перавыдання ўсёй вучэбнай літаратуры, паколькі змяняюцца не самі правілы — крыху іншымі стануць межы распаўсюджання таго ці іншага правіла. Фактычна ў выніку стане лягчэй вывучаць беларускую мову, таму што вучням трэба будзе засвойваць менш выключэнняў з таго ці іншага правіла.

— Заўвагі крытыкаў датычыліся і складу распрацоўшчыкаў...

— Падкрэслю, што над новай рэдакцыяй правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі працавалі найбольш аўтарытэтныя айчынныя спецыялісты. Была створана дзяржаўная камісія па праблемах беларускага правапісу, у склад якой увайшлі вядучыя мовазнаўцы краіны — спецыялісты нашага інстытута, вядучыя прафесары беларускіх універсітэтаў, аўтарытэтныя пісьменнікі. Яны дэталёва разгледзелі агульныя праблемы беларускага правапісу. У выніку было прызнана, што мэтазгодна падрыхтаваць новую рэдакцыю. Пасля гэтага першы варыянт новай рэдакцыі правілаў распрацавала рабочая група на чале з акадэмікам Аляксандрам Падлужным, сёння нябожчыкам, які быў буйнейшым спецыялістам у галіне беларускай фанетыкі і фаналогіі. А гэтыя аспекты вельмі важныя для праблем правапісу. У рабочую групу ўваходзілі Аляксандр Крывіцкі (вядомы спецыяліст па беларускай дыялекталогіі — гэты аспект важны таму, што беларуская літаратурная мова грунтуецца на народна-гутарковай аснове), прафесар Арнольд Міхневіч (спецыяліст у галіне беларускай марфалогіі і сінтаксісу), прафесар БДПУ Міхась Яўневіч (сінтаксіст), марфолаг і сінтаксіст прафесар Павел Шуба, цяпер нябожчык. Такім чынам, рабочая група аб'яднала найбольш аўтарытэтных беларускіх лінгвістаў, якія да 1998 года і падрыхтавалі першы варыянт новай рэдакцыі правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. Ён неаднаразова абмяркоўваўся і дапрацоўваўся з улікам заўваг і прапаноў. Некалькі разоў прадпрымаліся спробы ўвесці яго ў дзеянне. І вось два гады таму па ініцыятыве Міністэрства адукацыі была зроблена чарговая спроба ўвесці правілы ў дзеянне. Яна завяршылася ў рэшце рэшт прыняццем закона. У фінальным этапе яго падрыхтоўкі ўзялі ўдзел супрацоўнікі Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы, спецыялісты Міністэрства адукацыі і Нацыянальнага інстытута адукацыі, універсітэцкія выкладчыкі беларускай мовы, настаўнікі-практыкі. Кожнае пытанне было дэталёва абмеркавана і па ім было прынята ўзважанае, найбольш аптымальнае для сучаснай моўнай сітуацыі рашэнне.

— Па якіх правілах будуць праводзіцца выпускныя экзамены і цэнтралізаванае тэсціраванне ў наступныя два гады?

— Паколькі да 1 верасня 2010 года будуць дзейнічаць правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі 1959 года, то і ўсе матэрыялы, накіраваныя на выяўленне ўзроўню ведаў вучня, будуць поўнасцю адпавядаць дзеючым правілам. А надалей будзе распрацавана канкрэтная праграма пераходу, і магчыма, пасля 2010 года, гэта ўжо маё асабістае меркаванне, будзе нейкі перыяд, калі ў экзаменацыйных матэрыялы не будуць уключацца тыя лексічныя адзінкі, напісанне якіх падлягае зменам паводле правілаў, або будзе дапускацца варыянтнасць у такіх выпадках. Гэта абсалютна натуральная з'ява для сістэмы адукацыі, аднак гэта зноў жа прэрагатыва міністэрства. І ведаючы, як там вядзецца работа, я ўпэўнены, што будзе прынята найбольш разумнае і ўзважанае рашэнне, якое ні ў якім разе не адаб'ецца адмоўна на ацэнцы ўзроўню ведаў вучняў.

— Наколькі цяжка будзе адаптавацца да новаўвядзенняў тым, хто даўно адвучыўся?

— Мяркую, яны з лёгкасцю засвояць гэтыя нешматлікія змяненні ў працэсе карыстання мовай. Дастаткова будзе проста пачытаць тэксты, напісаныя з улікам новаўвядзенняў. Тым больш што яны, нагадаю, не парушаюць традыцыйны пераемнасці і закранаюць невялікую колькасць слоў, большасць якіх — іншамоўнага паходжання. Такія словы звычайна знаходзяцца на перыферыі слоўнікавага складу беларускай мовы: сустракаюцца пераважна ў спецыяльных, навуковых тэкстах. Аднак увядзенне гэтых правілаў вельмі важнае для школьнай практыкі, таму што дазволіць, па майму перакананню, спыніць той арфаграфічны разнабой, які сёння існуе на старонках беларускамоўных выданняў. Асабліва тых, што адрасаваны сярэдняй школе. Бо гэта не справа вучня і настаўніка — вызначаць, у якім з выданняў напісана правільна. Мы павінны верыць таму, што напісана, і ёсць такая традыцыя, што ў друкаваных тэкстах прадстаўлена ўзорная мова. Таму неабходна, каб нормы для іх былі адзінымі. І ў гэтым я таксама бачу карысць увядзення новай рэдакцыі правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі ў выглядзе закона. Я ўпэўнены, што гэта павысіць статус беларускай мовы як дзяржаўнай і побач з усім іншым, будзе спрыяць вывучанню беларускай мовы ў школе. Гэта ў чарговы раз замацуе за беларускай мовай статус мовы, здольнай паспяхова абслугоўваць усе камунікатыўныя патрэбы сучаснага грамадства. Тым больш, што на цяперашнім этапе роля беларускай мовы істотна ўзрастае менавіта з пункту гледжання прэзентацыі нацыянальнай адметнасці нашай дзяржавы ў сусветнай супольнасці.

— Такім чынам, для таго, каб жанчына магла выкарыстаць магчымасці сурагатнага мацярынства, неабходныя канкрэтныя медыцынскія паказанні. Акрамя гэтага, павінны адсутнічаць проціпаказанні да сурагатнага мацярынства як у бакоў дагавора, так і ў іх «другіх палавін». У сувязі з гэтым пастановай Міністэрства аховы здароўя ад 14 верасня 2006 года № 71 «Аб зацвярджэнні пераліку медыцынскіх паказанняў і проціпаказанняў да сурагатнага мацярынства, парадку і аб'ему медыцынскага абследавання сурагатнай маці, генетычнай маці і іх мужоў» вызначаны пералік медыцынскіх паказанняў і проціпаказанняў да сурагатнага мацярынства.

Дагавор сурагатнага мацярынства заключаецца паміж сурагатнай маці і генетычнай маці ў пісьмовай форме і падлягае абавязковаму натарыяльнаму засведчанню. Ад таго, наколькі правільна складзены дагавор, залежыць вырашэнне канкрэтных пытанняў у выпадку ўзнікнення якіх-небудзь канфліктных сітуацый паміж бакамі. Каб пазбегнуць вельмі важных для бакоў праблем у адносінах па выношванні дзіцяці, вельмі патрэбна, каб у дагавор былі ўключаны ўсе ўзгодненыя бакамі ўмовы, якія дазвалялі б, у выпадку неабходнасці, абараніць правы як генетычнай, так і сурагатнай маці.

НЕ ТОЛЬКІ ЦАНА ДАГАВОРА, АЛЕ І ШЭРАГ ІНШЫХ НЕ МЕНШ ІСТОТНЫХ УМОЎ

Абавязкова ў дагаворы павінны быць адлюстраваны ўсе істотныя умовы, г. зн. такія, без узгаднення якіх дагавор лічыцца незаключаным. Да такіх умоў адносяцца:

— аказанне адной жанчынай (сурагатнай маці) другой жанчыне (генетычнай маці) паслугі па імплантацыі эмбрыёна, выношванні і нараджэнні дзіцяці, зачатага з яйцаклеткі, узятай з арганізма генетычнай маці;

— указанне арганізацыі аховы здароўя, у якой будуць адбывацца імплантацыя эмбрыёна сурагатнай маці, назіранне за цячэннем яе цяжарнасці і народзіны;

— абавязак сурагатнай маці выконваць усе прадпісанні ўрача і прадастаўляць генетычнай маці і яе мужу інфармацыю аб сваім стане здароўя і стане здароўя дзіцяці, якое выношваецца;

— месца пражывання сурагатнай маці ў перыяд выношвання дзіцяці;

— абавязак сурагатнай маці перадаць генетычнай маці дзіця пасля яго нараджэння і тэрмін, на працягу якога павінна быць перададзена дзіця;

— абавязак генетычнай маці прыняць ад сурагатнай маці дзіця пасля яго нараджэння і тэрмін, на працягу якога павінна быць прынята дзіця;

— цана дагавора, якая ўключае ў тым ліку кошт паслугі, што аказваецца сурагатнай маці па дагаворы сурагатнага мацярынства (за выключэннем выпадкаў, калі дадзеная паслуга аказваецца бясплатна), а таксама выдаткі на медыцынскае абслугоўванне, харчаванне, пражыванне сурагатнай маці ў перыяд выношвання, народзінаў і пасля іх;

— іншыя ўмовы, адносна якіх на заяве аднаго з бакоў дасягнута пагадненне (напрыклад, умова пра колькасць спробаў пераносу эмбрыёна ў поласць маткі сурагатнай маці).

ГЕНЕТЫЧНАЯ МАЦІ БУДЗЕ З'ЯЎЛЯЦЦА АФІЦЫЙНАЙ ДЛЯ ЛЮБОГА НАРОДЖАНАГА ДЗІЦЯЦІ

Улічваючы прыроду дагавора, абодва бакі — генетычная і сурагатная маці, заключаючы дагавор, добраахвотна прымаюць на сябе пэўныя абавязкі. **Ніводны з бакоў не можа змяніць рашэнне пасля пачатку цяжарнасці.** Кожны бок павінен добрасумленна выконваць свае абавязкі.

— Вельмі важна, каб бакі ведалі, што **сурагатнае мацярынства прызначанае для таго, каб нарадзіць дзіця для генетычных бацькоў, г. зн. сурагатная маці не захоўвае ніякіх правоў ці абавязкаў у адносінах да дзіцяці, якога яна нарадзіла.** Іншымі словамі, сурагатная маці на момант заключэння дагавора павінна разумець тое, што яна абавязана перадаць дзіця генетычнай маці нават у тым выпадку, калі ў сілу матчыных пачуццяў, узніклых да дзіцяці, якога яна выношвае, пасля нараджэння дзіцяці перадумае і будзе выказваць нязгоду супраць перадачы біялагічна чужога ёй дзіцяці генетычнай маці. **Генетычная маці, у сваю чаргу, павінна разумець, што яна будзе з'яўляцца афіцыйнай маці любога народжанага дзіцяці,** — гаворыць Галіна Іваннікава.

Трэба яшчэ звярнуць увагу на наступны нюанс: калі генетычная або сурагатная маці знаходзіцца ў шлюбе, дык для засведчання дагавора сурагатнага мацярынства неабходная згода яе мужа.

Пры рэгістрацыі нараджэння дзіцяці, народжанага сурагатнай маці, маці дзіцяці прызнаецца яго генетычная маці. Бацькам дзіцяці, народжанага сурагатнай маці, прызнаецца муж генетычнай маці. Калі генетычная маці не знаходзіцца ў шлюбе з бацькам дзіцяці, бацькоўства можа быць устаноўлена ў адпаведнасці з часткамі 5 і 6 артыкула 51 Кодэксу Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і.

У запісе акта аб нараджэнні таксама ўказваецца, кім, калі і за якім нумарам па рэестры для рэгістрацыі натарыяльных дзеянняў засведчаны дагавор сурагатнага мацярынства.

Падрыхтаваў Сяргей РАСОЛЬКА.

Кансультацыя натарыуса

СУРАГАТНАЕ МАЦЯРЫНСТВА: МЕДЫЦЫНСКІЯ І ПРАВАВЫЯ АСПЕКТЫ ПЫТАННЯ

Правільна складзены і натарыяльна засведчаны дагавор — зарука вырашэння канфліктных сітуацый паміж бакамі

Поспехі медыцыны ў галіне рэпрадукцыйных тэхналогій падарылі надзею тым людзям, якія ўжо страцілі надзею мець дзяцей. Сурагатнае мацярынства з'яўляецца адным з маральна прымальных метадаў дапаможных рэпрадукцыйных тэхналогій. Яно дае шанц мець дзіця жанчынам (сямейным парам), якія ў сілу фізічных асаблівасцяў або медыцынскіх проціпаказанняў не могуць самастойна зачаць, вынасіць і нарадзіць дзіця.

У сувязі з гэтым вельмі важным з'яўляецца прававое забеспячэнне сурагатнага мацярынства, якое дазваляе абараніць усе бакі, гарантаваць прыняцце абдуманага рашэння і зменшыць рызыку, найперш звязаную з нежаданнем сурагатнай маці аддаваць дзіця генетычнай маці.

ШТО З'ЯЎЛЯЕЦЦА СУРАГАТНЫМ МАЦЯРЫНСТВАМ ПАВОДЛЕ ЗАКАНАДАЎСТВА?

— Паняцце «сурагатнае мацярынства» з медыцынскага і прававога пунктаў гледжання істотна адрозніваюцца, — **гаворыць адзін з кансультантаў «Звязды» па натарыяльных пытаннях намеснік загадчыка першай Мінскай гарадской дзяржаўнай натарыяльнай канторы Галіна ІВАННІКАВА.** — З медыцынскага пункту гледжання тэрмін «сурагатнае мацярынства» ахоплівае некалькі розных метадаў: «сурагатная маці» — гэта асоба, якая цяжарае, выношвае і нараджае дзіця для іншай жанчынай (сямейнай пары), прычым яна можа быць і не быць звязаная з будучым дзіцем генетычна.

З прававога пункту гледжання, які атрымаў замацаванне ў артыкуле 53 Кодэксу аб шлюбе і сям'і, сурагатным мацярынствам прызнаюцца заснаваныя на дагаворы імплантацыя эмбрыёна, выношванне і нараджэнне жанчынай (сурагатнай маці) дзіцяці, зачатага з яйцаклеткі, узятай з арганізма іншай жанчыны (генетычнай маці), калі выношванне і нараджэнне дзіцяці генетычнай маці фізіялагічна немагчымыя ці звязаныя з рызыкай для жыцця генетычнай маці і (ці) дзіцяці.

— Аналізуючы нормы ўказанага артыкула, можна гаварыць пра тое, што **на заканадаўчым узроўні замацавана толькі такое сурагатнае мацярынства, пры якім выкарыстоўваюцца яйцаклеткі, узятыя з арганізма генетычнай маці,** — працягвае Галіна Міхайлаўна. — Пры гэтым **абавязковай умовай для сурагатнага мацярынства з'яўляецца той факт, што выношванне і нараджэнне дзіцяці генетычнай маці фізіялагічна немагчымыя ці звязаныя з рызыкай для жыцця генетычнай маці і (ці) дзіцяці.** Іншыя метады, хоць і таксама заснаваныя на сучасных рэпрадукцыйных тэхналогіях, не з'яўляюцца паводле дзеючага заканадаўства сурагатным мацярынствам.

ДАГАВОР ПАМІЖ СУРАГАТНАЙ І ГЕНЕТЫЧНАЙ МАЦІ — У ПІСЬМОВАЙ ФОРМЕ

Такім чынам, для таго, каб жанчына магла выкарыстаць магчымасці сурагатнага мацярынства, неабходныя канкрэтныя медыцынскія паказанні. Акрамя гэтага, павінны адсутнічаць проціпаказанні да сурагатнага мацярынства як у бакоў дагавора, так і ў іх «другіх палавін». У сувязі з гэтым пастановай Міністэрства аховы здароўя ад 14 верасня 2006 года № 71 «Аб зацвярджэнні пераліку медыцынскіх паказанняў і проціпаказанняў да сурагатнага мацярынства, парадку і аб'ему медыцынскага абследавання сурагатнай маці, генетычнай маці і іх мужоў» вызначаны пералік медыцынскіх паказанняў і проціпаказанняў да сурагатнага мацярынства.

Дагавор сурагатнага мацярынства заключаецца паміж сурагатнай маці і генетычнай маці ў пісьмовай форме і падлягае абавязковаму натарыяльнаму засведчанню. Ад таго, наколькі правільна складзены дагавор, залежыць вырашэнне канкрэтных пытанняў у выпадку ўзнікнення якіх-небудзь канфліктных сітуацый паміж бакамі. Каб пазбегнуць вельмі важных для бакоў праблем у адносінах па выношванні дзіцяці, вельмі патрэбна, каб у дагавор былі ўключаны ўсе ўзгодненыя бакамі ўмовы, якія дазвалялі б, у выпадку неабходнасці, абараніць правы як генетычнай, так і сурагатнай маці.

НЕ ТОЛЬКІ ЦАНА ДАГАВОРА, АЛЕ І ШЭРАГ ІНШЫХ НЕ МЕНШ ІСТОТНЫХ УМОЎ

Абавязкова ў дагаворы павінны быць адлюстраваны ўсе істотныя умовы, г. зн. такія, без узгаднення якіх дагавор лічыцца незаключаным. Да такіх умоў адносяцца:

— аказанне адной жанчынай (сурагатнай маці) другой жанчыне (генетычнай маці) паслугі па імплантацыі эмбрыёна, выношванні і нараджэнні дзіцяці, зачатага з яйцаклеткі, узятай з арганізма генетычнай маці;

— указанне арганізацыі аховы здароўя, у якой будуць адбывацца імплантацыя эмбрыёна сурагатнай маці, назіранне за цячэннем яе цяжарнасці і народзіны;

— абавязак сурагатнай маці выконваць усе прадпісанні ўрача і прадастаўляць генетычнай маці і яе мужу інфармацыю аб сваім стане здароўя і стане здароўя дзіцяці, якое выношваецца;

— месца пражывання сурагатнай маці ў перыяд выношвання дзіцяці;

— абавязак сурагатнай маці перадаць генетычнай маці дзіця пасля яго нараджэння і тэрмін, на працягу якога павінна быць перададзена дзіця;

— абавязак генетычнай маці прыняць ад сурагатнай маці дзіця пасля яго нараджэння і тэрмін, на працягу якога павінна быць прынята дзіця;

— цана дагавора, якая ўключае ў тым ліку кошт паслугі, што аказваецца сурагатнай маці па дагаворы сурагатнага мацярынства (за выключэннем выпадкаў, калі дадзеная паслуга аказваецца бясплатна), а таксама выдаткі на медыцынскае абслугоўванне, харчаванне, пражыванне сурагатнай маці ў перыяд выношвання, народзінаў і пасля іх;

— іншыя ўмовы, адносна якіх на заяве аднаго з бакоў дасягнута пагадненне (напрыклад, умова пра колькасць спробаў пераносу эмбрыёна ў поласць маткі сурагатнай маці).

ГЕНЕТЫЧНАЯ МАЦІ БУДЗЕ З'ЯЎЛЯЦЦА АФІЦЫЙНАЙ ДЛЯ ЛЮБОГА НАРОДЖАНАГА ДЗІЦЯЦІ

Улічваючы прыроду дагавора, абодва бакі — генетычная і сурагатная маці, заключаючы дагавор, добраахвотна прымаюць на сябе пэўныя абавязкі. **Ніводны з бакоў не можа змяніць рашэнне пасля пачатку цяжарнасці.** Кожны бок павінен добрасумленна выконваць свае абавязкі.

— Вельмі важна, каб бакі ведалі, што **сурагатнае мацярынства прызначанае для таго, каб нарадзіць дзіця для генетычных бацькоў, г. зн. сурагатная маці не захоўвае ніякіх правоў ці абавязкаў у адносінах да дзіцяці, якога яна нарадзіла.** Іншымі словамі, сурагатная маці на момант заключэння дагавора павінна разумець тое, што яна абавязана перадаць дзіця генетычнай маці нават у тым выпадку, калі ў сілу матчыных пачуццяў, узніклых да дзіцяці, якога яна выношвае, пасля нараджэння дзіцяці перадумае і будзе выказваць нязгоду супраць перадачы біялагічна чужога ёй дзіцяці генетычнай маці. **Генетычная маці, у сваю чаргу, павінна разумець, што яна будзе з'яўляцца афіцыйнай маці любога народжанага дзіцяці,** — гаворыць Галіна Іваннікава.

Трэба яшчэ звярнуць увагу на наступны нюанс: калі генетычная або сурагатная маці знаходзіцца ў шлюбе, дык для засведчання дагавора сурагатнага мацярынства неабходная згода яе мужа.

Пры рэгістрацыі нараджэння дзіцяці, народжанага сурагатнай маці, маці дзіцяці прызнаецца яго генетычная маці. Бацькам дзіцяці, народжанага сурагатнай маці, прызнаецца муж генетычнай маці. Калі генетычная маці не знаходзіцца ў шлюбе з бацькам дзіцяці, бацькоўства можа быць устаноўлена ў адпаведнасці з часткамі 5 і 6 артыкула 51 Кодэксу Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і.

У запісе акта аб нараджэнні таксама ўказваецца, кім, калі і за якім нумарам па рэестры для рэгістрацыі натарыяльных дзеянняў засведчаны дагавор сурагатнага мацярынства.

Падрыхтаваў Сяргей РАСОЛЬКА.

Гісторыя і сучаснасць

КАБ ВАЙНА БЫЛА ГУМАННАЙ. А ЛЕПЕЙ, КАБ ЯЕ ЗУСІМ НЕ БЫЛО

Ёсць такія дзяржаўныя органы і ўстановы, з якімі звычайны чалавек кантактуе вельмі часта: міліцыя, паліклінікі, камунальныя службы, сельскія саветы і выканкамы. Чым яны займаюцца — усім вядома, і пытанняў пра іх дзейнасць не ўзнікае. А ёсць такія органы, пра якія большасць насельніцтва нават і не чула. Ну вось, напрыклад, Камісія па імплементацыі міжнароднага гуманітарнага права пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь. Правядзіце эксперымент: спытайце ў каго са сваіх родных ці сяброў, чым гэтая камісія займаецца. Ну што? Правільна, нічога пэўнага не пачулі, хіба толькі «раз пры Саўміне, значыць, высокая ўстанова». І я, прызнаюся, ніколі не чуў пра яе, пакуль жыццё не сутыкнула. Мы прапануем інтэрв'ю з Яраславам Буднікам, сакратаром Камісіі па імплементацыі міжнароднага гуманітарнага права і адначасова намеснікам начальніка ўпраўлення прававога забеспячэння знешніх сувязяў Міністэрства юстыцыі.

Яраслаў БУДНІК, сакратар Камісіі па імплементацыі міжнароднага гуманітарнага права, намеснік начальніка ўпраўлення прававога забеспячэння знешніх сувязяў Міністэрства юстыцыі

— Назва ў камісіі вялікая і «закручаная», то давайце спачатку разбяромся, што ж такое міжнароднае гуманітарнае права і што такое імплементацыя?

— Добра, давайце. Міжнароднае гуманітарнае права — гэта галіна міжнароднага публічнага права, якая мае два асноўныя напрамкі: першы — абмежаванне сродкаў і метадаў вядзення ўзброеных канфліктаў, то бок забароны, напрыклад, на выкарыстанне асобных відаў зброі — лазерная асляпляльнай ці супрацьпяхотных мін і г.д., а другі — абарона ахвяраў узброеных канфліктаў, гэта значыць асобаў, якія не прымаюць непасрэднага ўдзелу ў канфлікце. І вось асноўная задача міжнароднага гуманітарнага права — гэта максімальная гуманізацыя вайны, хаця, шчыра кажучы, вайна і гуманнасць — рэчы абсалютна супрацьлеглыя. Таму ўнікальнасць міжнароднага гуманітарнага права ў тым і заключаецца, што яно спрабуе аб'яднаць гэтыя паняцці, каб вайна, калі яна здараецца, вялася цывілізавана, а не па-варварску.

Асноўнымі крыніцамі міжнароднага гуманітарнага права з'яўляюцца 4 Жэнеўскія канвенцыі 1949 года і дадатковыя пратаколы да іх 1977 года. Гэтыя дакументы складаюць так званае Жэнеўскае права, якое датычыцца непасрэдна ахвяраў узброеных канфліктаў. Дарэчы, Жэнеўскія канвенцыі адметныя тым, што ўсе дзяржавы свету, абсалютна ўсе, удзельнічаюць у іх. Аналагічныя прыклады ў міжнародным праве наогул цяжка адшукаць.

Ёсць яшчэ і Гаагскае права, якое больш старое. Яно ўзнікла па выніках Гаагскіх канферэнцый 1899 і 1907 гадоў і атрымала развіццё ў шматлікіх міжнародных канвенцыях, якія датычацца абмежавання сродкаў і метадаў вядзення вайны, напрыклад, у Гаагскай канвенцыі аб ахове культурных каштоўнасцяў у выпадку ўзброенага канфлікту 1954 года.

А імплементацыя — гэта працэс рэалізацыі краінамі ўзятых на сябе абавязацельстваў на міжнародным і ўнутрыдзяржаўным узроўні, карэкціроўка нацыянальнай прававой сістэмы ў адпаведнасці з гэтымі абавязацельствамі.

— Мяркуючы па даце, адной з прычын прыняцця Жэнеўскіх канвенцый 1949 года была Другая сусветная вайна, так?

— Так. Але і да Жэнеўскіх канвенцый існавалі міжнародныя дамовы, што рэгулявалі абарону ахвяраў вайны, толькі яны былі не так шырока распаўсюджаныя. А падчас Другой сусветнай вайны нярэдка ўзнікалі выпадкі грубага парушэння правоў як удзельнікаў узброенага канфлікту, так і цывільнага насельніцтва. Ёсць такі тэрмін — камбатант, якім называюць законнага ўдзельніка ўзброенага канфлікту. На яго распаўсюджваюцца тыя гарантыі, што змешчаны ў Жэнеўскіх канвенцыях (у выпадку, калі ён быў паранены ці трапіў у палон). А ёсць незаконныя ўдзельнікі канфлікту, напрыклад, шпегі, наёмнікі. І яны ўжо не маюць адпаведных прывілеяў. Вось, напрыклад, падчас Другой сусветнай нямецкія войскі не разглядалі партызанаў як камбатантаў, а значыць пазбаўлялі іх таго аб'ёму правоў, што існуюць у законных удзельнікаў узброенага канфлікту. У Жэнеўскіх канвенцыях выпрацаваны ўсе недахопы, што «ўсплылі» падчас Другой сусветнай вайны, а самі канвенцыі з'яўляюцца апалітычнымі, імкнуцца абараніць асноўныя правы чалавека пры ўзброеным канфлікце, і таму ў іх удзельнічаюць усе дзяржавы незалежна ад рэлігійных і палітычных перавар.

— А сёння партызаны прызнаюцца камбатантамі ці не?

— Згодна з Жэнеўскімі канвенцыямі 1949 года партызаны прызнаюцца камбатантамі, калі яны маюць на чале асобу, адказную за сваіх падначаленых, і распазнавальны знак, адкрыта носяць зброю і выконваюць законы і звычаі вайны. У такім выпадку на іх распаўсюджваецца ўвесь аб'ём прававой абароны, як і на іншых камбатантаў.

— Добра, давайце зараз пагутарым пра Камісію па імплементацыі міжнароднага гуманітарнага права. Як я разумею, яна дзейнічае пры Савеце Міністраў Беларусі?

— Так, яна з'яўляецца кансультацыйным міжведамасным органам Урада. Ва ўсім свеце аналагічныя камісіі існуюць недзе ў 80 краінах...

— А чаму толькі ў 80-ці? Усе ж краіны ўдзельнічаюць у Жэнеўскіх канвенцыях, то чаму ж камісій так мала? Яны імплементацыяй не займаюцца?

— Ажыццяўляюць безумоўна! Нельга з'яўляцца ўдзельнікам Жэнеўскіх канвенцый і не імплементаваць іх, бо гэта — міжнародныя дамовы. А ўсе міжнародныя дамовы падпарадкоўваюцца прынцыпу Pacta sunt servanda, які азначае, што дамовы павінны выконвацца. Таму краіны, што ўдзельнічаюць у Жэнеўскіх канвенцыях, згодна з гэтым прынцыпам павінны імплементаваць у сваё заканадаўства іх палажэнні. Але найбольшы плён, і гэта прызнана Міжнародным Камітэтам Чырвонага Крыжа, прыносіць меналіта дзейнасць спецыяльных органаў, аналагічных нашай камісіі. У Беларусі Камісія па імплементацыі міжнароднага гуманітарнага права была створана ў 1997 годзе адной з першых на постсавецкай прасторы, яе структура такая ж, як і ў іншых дзяржавах. У камісіі ўдзельнічаюць перш за ўсё прадстаўнікі Міністэрства юстыцыі — старшынёй камісіі з'яўляецца міністр юстыцыі Віктар Галавануў, сакратарыят камісіі — гэта нашае ўпраўленне забеспячэння знешніх сувязяў Мінюста. Акрамя гэтага, у склад камісіі ўваходзяць прадстаўнікі міністэрстваў абароны, замежных і ўнутраных спраў, адукацыі, аховы здароўя, культуры, Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў, Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа, то бок, як бачыце, кола ўдзельнікаў вельмі шырокае.

— Імплементацыя — слова досыць абстрактнае, як гэтую самую імплементацыю вы здзяйсняеце?

— Па-першае, мы садзейнічаем прывядзенню нацыянальнага заканадаўства ў адпаведнасць з міжнароднымі абавязацельствамі ў сферы міжнароднага гуманітарнага права, а таксама адсочваем сітуацыю ў краіне з пункту гледжання міжнароднага гуманітарнага права, у тым ліку і з дапамогай СМІ. І калі знаходзім у дзеяннях дзяржаўных органаў, арганізацый, грамадзян прыклады парушэння абавязкаў у рамках міжнароднага гуманітарнага права, то такія пытанні мы выносім на разгляд камісіі. А пасля пасяджэння камісіі прынятыя рашэнні даводзім да ведама і выканання тых органаў і арганізацый, якіх гэта тычыцца. Акрамя таго, звяртаемся з прапановамі ва Урад, бо камісія — кансультацыйны орган і мы не маем такіх паўнамоцтваў, якія мае Савет Міністраў. Па-другое, мы пастаянна ўдзельнічаем у афармленні далучэння Рэспублікі Беларусь да міжнародных канвенцый. Вось, напрыклад, пры падтрымцы камісіі ў гэтым годзе нашая краіна далучылася да V пратакола Канвенцыі аб «негуманнай зброі», у якім прадугледжваецца максімальнае супрацоўніцтва дзяржаў пасля таго, як яны спынілі вайну: абмен інфармацыяй пра мінныя палі, іншыя аб'екты, што могуць прынесці шкоду цывільнаму насельніцтву. Па-трэцяе, мы займаемся распаўсюджаннем ведаў пра міжнароднае гуманітарнае права: праводзім семінары, канферэнцыі, па іх выніках выдаём зборнікі.

— А вось з 1997 года якія найбольш значныя дасягненні можаце назваць?

— Гэта прыняцце шэрагу законаў, у тым ліку «Аб Беларускім Таварыстве Чырвонага Крыжа», «Аб выкарыстанні і абароне эмблем Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца»...

— Пасля гэтага на машынах хуткай дапамогі зніклі чырвоныя крыжы?

— Абсалютна правільна! Бо згодна з Жэнеўскімі канвенцыямі эмблема Чырвонага Крыжа выкарыстоўваецца для абазначэння санітарных службаў армій. Цывільныя медыцынскія фарміраванні не могуць выкарыстоўваць гэтую эмблему ў мірны час. Але ў нас так склалася яшчэ з часоў СССР, што Чырвоны Крыж выкарыстоўваўся цывільнымі медыцынскімі ўстановамі: на машынах быў, аптэках і г.д. Нельга дапускаць, каб што ні крок была эмблема Чырвонага Крыжа, бо гэта парушэнне Жэнеўскіх канвенцый. Дарэчы, у нашай краіне пасля прыняцця гэтага закона і ўнясення адпаведных дапаўненняў у Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях і Крымінальны кодэкс выпадкаў неправамернага выкарыстання эмблемы Чырвонага Крыжа фактычна не назіраецца. Аднак нашая праца ў гэтай галіне яшчэ не завершаная, бо зараз Міжнародны Камітэт Чырвонага Крыжа разам з вядомымі эмблемамі Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца ўводзіць новую эмблему — Чырвоны Крышталь. Пасля далучэння да адпаведнай міжнароднай дамовы нам трэба будзе распрацаваць і ўнесці змяненні ў беларускае заканадаўства.

Што яшчэ намі зроблена? Летась правялі міжнародную канферэнцыю пра актуальныя пытанні міжнароднага гуманітарнага права, на якую сабралася паўсотні ўдзельнікаў з розных краін. Можна ўспомніць далучэнне Беларусі ў 2005 годзе да Факультатыўнага пратакола Канвенцыі аб правах дзіцяці, які датычыцца ўдзелу няпоўнагадовых ва ўзброеных канфліктах, пасля чаго ўносіліся змены

КОЛАЙ раскрытых душ і дзвярэй
КОНКУРС «ЛЕПШАЯ СЯДЗІБА ГОДА»

Клясціцы: шчаслівае падарожжа ў часе

Сядзіба «Гусарская».

Спакой. Самае першае і галоўнае слова, якім хочацца перадаць ураженне ад наведвання сядзібаў у Расонскім раёне — спакой і цішыня. Тут і людзі немітуслівыя, няшумныя, ненавязлівыя. Яны спачатку падымуць на цябе вочы, упэўняцца, што слухаеш, а тады не спяшаючыся, без усякага націску скажуць. Пакідаючы права самому вырашаць, наколькі важную інфармацыю ты пачуў. І праз некаторы час, ужо дастаткова вызваліўшыся ад зададзенага горадам бесталковага рытму, ты адчуеш, што людзі на Расоншчыне слоў на вецер не кідаюць, што практычна ўсё, пра што яны апавядаюць, можна, як каштоўныя каменьчыкі, складваць у скарбонку памяці.

Гаспадыня Ала ХОРАНЬ.

«Мы людзі ўжо немаладыя, якія шмат чаго пабачылі, — напісалі ў кнізе водгукаў Хораняў Сяргей і Таццяна Гара з Падольска, якія разам з унукам Дзмітрыем адпачывалі на пачатку ліпеня ў сядзібе «Гусарская». — Схаваліся тут ад штодзённых спрынтэрскіх забегаў, мітусні, дарожных затораў і ўдушлівага маскоўскага смогу. Тут, на беразе ціхай рэчкі, са шчабятаннем птушак, з адчуваннем шчасця і спакою мы правялі час нашага адпачынку. О, калі б мы толькі ведалі раней, як тут добра! Тады абавязкова адразу прыехалі б у гэты цудоўны, улюбёны Богам куток Беларусі. А гаспадары! Якімі абедамі яны нас кармілі! Баршчы і смажанкі проста з печы, а блінцы з сырам і са смятанай! Мы ўжо не кажам аб хатнім ёгурце з ягадамі! Уяўляеце? Які там «Данон»? Ён проста адпачывае. А малако, а сыр з маслам і смятанай, і ўсё тут хатняе, супер! А якая лазня! Проста няма слоў. Мы вельмі ўдзячныя гаспадарам Але і Генадзю Хорань за стварэнне гэтага райскага кутка. Гэта ў першую чаргу працаўнікі, добрыя, адкрытыя, вельмі прыемныя людзі. Нізкі вам паклон, вялікі сардэчны дзякуй. Мы яшчэ не паехалі дадому, а ўжо плануем вярнуцца сюды на наступны год. Бо ад дабра дабра не шукаюць».

Лазні ў Клясціцах спрадвеку будуюць на беразе Нішчы.

Летась у сядзібе «Хорань» пабыў 191 чалавек, за гэты год ужо — больш за 200. У сядзібе «Гусарскай», якая працуе першы сезон, — 25 чалавек.

Мост

Вось Ала Хорань стаіць ля печы ў сядзібе «Гусарская» і проста так, нібы між іншым, кажа:

— Год таму гідраэлектрастанцыю нашу закрылі, вада ў рацэ спала і стаў бачны мост, па якім у 1812 годзе рускія войскі пераправіліся праз Нішчу. Мы і не ведалі, што мост гэты захаваўся.

Калі за спакойным тонам гэтай жанчыны адчуць, наколькі ўнікальная сітуацыя склалася зараз у Клясціцах, то можна даведацца пра дзіўную гісторыю, дзякуючы якой вёска ўвайшла ў сусветны летапіс ваенных паходаў.

І тады гаспадыня сядзібы расказа, што, па-першае, Расоншчына праславілася як партызанскі край яшчэ ў Айчынную вайну 1812 года, калі на захопленых французамі тэрыторыях мясцовыя жыхары не толькі былі праваднікамі і разведчыкамі партызанскіх атрадаў, але і самастойна ўступалі ў бойкі з дробнымі групамі ворага. Праз 130 гадоў, у Вялікую Айчынную, гэтыя мясціны ўвогуле сталі вольнай ад захопнікаў партызанскай зонай. На тэрыторыі 10 тысяч квадратных кіламетраў з колькасцю насельніцтва больш за 100 тысяч чалавек у 1942—43 гадах была адноўлена савецкая ўлада, выдаваліся газеты, працавалі прадпрыемствы, майстэрні, электрастанцыі, дзейнічалі аэрадромы, падтрымлівалася двухбаковая радыёсувязь з Вялікай зямлёй. Гітлераўцы называлі гэтыя мясціны «бандыцкай рэспублікай Расоны» і неаднаразова беспаспяхова спрабавалі яе ліквідаваць.

Па-другое, мост, які захаваўся з часоў напалеонаўскага паходу, праз некалькі дзён, калі электрастанцыя будзе запушчана, зноў схаваецца пад ваду. Зараз у Клясціцах рэдкая магчымасць уявіць, як усё адбывалася тады, 19 ліпеня (па старым стылі) 1812 года.

Гэта быў ужо другі дзень лютага бою паміж корпусам генерала Вітгенштэйна, якому было даручана прыкрываць дарогу на Пецярбург, і войскамі французскага маршала Удзіна, што перавышалі рускіх у сіле. Напярэдадні сядзіба Якубава, за два кіламетры ад Клясціц, неаднаразова пераходзіла ў рукі то першых, то другіх. У тры гадзіны раніцы, пасля кароткага начнога перапынку, рускія аднавілі атаку і адцяснілі французаў да Клясціц. Такім чынам у 8 гадзін на левым беразе Нішчы стаялі французы, а на правым — рускія, і адзінай пераправай паміж імі быў мост, які знаходзіўся пад беспе-

рапынным агнём французскіх гармат і стралкоў. Урэшце французы мост падпалілі. І вось тады, праз полымя і кулі, мост перабеглі грэнадзёры Паўлаўскага батальёна. Яны адцяснілі французаў ад ракі і далі магчымасць пераправіцца іншым войскам на левы бераг. Праследаванне напалеонаўскай арміі працягвалася да Полацка, Вітгенштэйну ўдалося захапіць амаль увесь абоз Удзіна і 9 тысяч палонных. Гэта быў першы поспех рускай арміі на пачатку Айчыннай вайны 1812 года.

У гонар перамогі пад Клясціцамі полк Гродзенскіх гусараў пад камандаваннем легендарнага генерала Якава Кульнёва атрымаў назву «Клясціцкі». Гэта, бадай, адзіны выпадак у рускай арміі, калі імя невялікай вёскі было прысвоена вайсковаму падраздзяленню. Пазней баварскі прыдворны мастак Петэр фон Гес намаляваў карціну «Бітва пры Клясціцах 19 ліпеня 1812 года». Зараз яна захоўваецца ў Эрмітажы.

Сядзіба

Сядзіба «Гусарская», названая так у гонар бясстрашных гусар, якія, цалкам верагодна, якраз у гэтым месцы амаль 200 гадоў таму спыніліся пасля бою на кароткі перадых, належыць мужу Алы Хорань Генадзю. Гэта спачатку ён скептычна глядзеў на задумы і клопаты жонкі зрабіць былую партызанскую зону турыстычнай «меккай». Потым паверыў і распачаў дзейнасць.

Сядзіба «Гусарская» — асабліва. Можа, таму, што самі гаспадары тут не жывуць, гэта — сапраўды дом. У гасцей ёсць магчымасць жыць адасоблена, самім адчуваць сябе гаспадарамі. Акрамя таго, гэта дазволіла амаль цалкам вярнуць сядзібе першародны выгляд, у тым ліку старадаўні інтэр'ер. Хорані знялі напластаванні апошніх дзесяцігоддзяў — шпалеры, старанна вычысцілі сцены знутры і звонку і пакінулі бярвёны такімі, якімі яны былі, калі хату гэту гадоў 60 таму толькі паставілі. Адпаведная тут і мэбля: праслаўленная канапа з драўлянай спінкай, ложкі, круглы стол, крэслы. Усё ашчадна адрэстаўраванае, чысценькае, утульнае. Ствараецца ўражанне, нібы патрапіў у часе гадоў гэтак на шэсцьдзесят таму, і зараз зойдзе ў дом твая маладая бабуля, нічому не здзівіцца, паставіць на стол даёнку, поўную сырадою, і з усмешкай прапануе адпіць пульхную духмяную пену.

Разам з тым вельмі ўмела і акуратна гаспадары сядзібы ўвялі сучасныя рэчы, якія зрабілі сядзібу камфортнай: санвузел, душавую кабіну, награвальнік вады, тэлевізар. Усё гэта амаль непрыкметна ўпісана ў інтэр'ер, не перашкаджае чароўнаму вандраванню ў часе.

Гэтакі ж, адпаведны чаканню ідыліі, двор. Прасторны, засланы травяным дываном, па краях схаваны ад суседзяў старымі дрэвамі, ён спускаецца да самай Нішчы. Тут, на беразе, стаіць лазня, ад якой цягнецца ў раку, запрашае разбегчыся і скокнуць у прахалодную ваду кладка.

— Няма нічога лішняга, — каментуе ўбачанае **эксперт конкурсу «Лепшая сядзіба года» доктар архітэктуры Сяргей СЕРГАЧОЎ**. — Гаспадары захавалі аўтэнтычнасць, паказалі матэрыял, з якога зроблены дом, вельмі ўдала сыгралі на прастаце. Тут усюды прыемна воку, усё зроблена прадумана і з густам. Яшчэ мне спадабалася, як з пуні, што побач з домам, гаспадары зрабілі альтанку. Яны забралі адну сцяну, і атрымалася яшчэ адно ўтульнае і прасторнае месца адпачынку. І добра, што яно не ў доме, а на вуліцы — гэткае месца агульных пасядзелак.

Гаспадыня

Клясціцы — на поўначы Беларусі. Мы выехалі з Віцебска а палове дзесятай вечара і былі на месцы праз дзве гадзіны. Нас чакаў накрыты стол, хатняя каўбаса ў печы і распаленая лазня. «Гусарская» — адна з дзевяці аграсядзібаў у Клясціцкім сельсавеце. Усяго на Расоншчыне 30 аб'ектаў аграэкатурызму.

— Расонскі раён самы багаты на крэдытаатрымальнікаў сярод аграсядзібаў, — заўважыў **прадстаўнік Белаграпрамбанка Кірыл КРАСНІЦКІ**. — І я з задавальненнем бачу, што гэтыя грошы працуюць на развіццё.

Поспеху садзейнічае супрацоўніцтва паміж гаспадарамі сядзібаў і мясцовай уладай. У Клясціцах створаны Інфармацыйны цэнтр развіцця сельскага прадпрымальніцтва, якому сельсавет выдзеліў памяшканне. Пакуль у Цэнтра няма фінансавання, але ёсць ужо першыя вынікі работы, адным з галоўных з'яўляецца якраз павелічэнне колькасці турыстычных сядзібаў. Ала Хорань з задавальненнем расказвае, што на апошнім навучальным семінары, які праводзіў Цэнтр, сабраліся 23 чалавекі — патэнцыйныя гаспадары вясковых міні-гасцініц. І што самае галоўнае, сярод іх былі маладыя людзі, якія толькі закончылі ВНУ. А калі нешта становіцца цікавым для моладзі, значыць, будучае забяспечана. Значыць, у моладзі з'явіцца важкая нагода не ўцякаць з вёскі.

У пашырэнні руху аграэкатурызму на Расоншчыне немалая роля належыць Але Хорань, гэтай з выгляду вельмі спакойнай, ціхай жанчыне. Яна быццам бы нікуды не спяшаецца, але ўсё паспявае. Акрамя «Гусарскай», яна прымае гасцей у сваім уласным доме, на сядзібе «Хорань». Мае немалую гаспадарку — дзве каровы, парсючка. Яшчэ адзін вясковы дом рамантуе, каб зрабіць там чайную. Акрамя клопату аб развіцці Інфармацыйнага цэнтра ў Клясціцах, Ала займаецца адкрыццём Цэнтра экалагічнай асветы ў вёсцы Забор'е. Яна ўзначальвае прыродаахоўную ўстанову «Эка-Росы», якая ўключае ў сябе рэспубліканскія ландшафтныя заказнікі «Красны Бор» і «Сіньша». Сядзібы Расоншчыны і заказнікі дапаўняюць адно аднаго і робяць турызм тут сапраўды ўнікальным, цікавым як людзям звычайным, так і спецыялістам. Тут распрацаваны веласіпедныя, водныя і пешыя маршруты, якія ўжо палюбіліся замежным гасцям.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.
В. Клясціцы, Расонскі раён.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.55	20.30	14.35
Віцебск —	5.41	20.23	14.42
Магілёў —	5.45	20.20	14.35
Гомель —	5.46	20.12	14.26
Гродна —	6.11	20.44	14.33
Брэст —	6.16	20.40	14.24

Месяц

Поўня.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *ДРУГІ СПАС (ПРААБРАЖЭННЕ ГАСПОДНЯЕ).*
К. *Канстанцыі, Андрэя, Баляслава, Юльяна, Яна.*

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА +24..+26°C	КІЕЎ +28..+30°C	РЫГА +18..+20°C
ВІЛЬНЮС +25..+27°C	МАСКВА +23..+25°C	С.-ПЕЦЯРБУРГ +18..+20°C

Дзве даты

19 жніўня

1933 год — органы АДПУ БССР правялі арышты па справе выдуманай «контрэвалюцыйнай паўстанцкай і шпіёнска-дыверсійнай арганізацыі — «Беларускі нацыянальны цэнтр» на чале з Рак-Міхайлоўскім, Дварчанінавым, Мятлой. Было арыштавана больш як 160 адказных работнікаў дзяржаўных, партыйных, навуковых і іншых устаноў і арганізацый. Большасць з іх была адпраўлена на Салаўкі, 22 чалавекі расстраляны.

1991 год — жнівеньскі путч: спроба антыканстытуцыйнага перавароту, зробленая кансерватыўным крылом кіраўніцтва СССР і КПСС. Быў накіраваны на аднаўленне ў поўным аб'ёме ўлады партыйна-дзяржаўнай наменклатуры.

Цытата дня:

«Калі парада добрая — няважна, хто яе даў».
Томас Фулер (1608—1661), англійскі багаслоў і гісторык.

ЯБЛЫНЯ

Яблыня — па ўяўленнях нашых продкаў, дрэва, якое ўзнікла напачатку стварэння свету і аб'ядноўвала ў сабе тры пачаткі: неба, зямлю і падземны свет. Біблейскім дрэвам пазнання дабра і зла была менавіта яблыня, плод якой пакаштавалі Адам і Ева. Так першыя людзі былі выгнаны з раю і сталі жыць на зямлі. Можа, менавіта таму ў паданнях крыж, на якім быў раскрыжаваны Хрыстос, быў зроблены з яблыні. Ісус Хрыстос стаў ахвярай за грахі Адама, а яблык стаў сімвалізаваць Збавіцеля.

Яблыня стала сімвалам вечнага жыцця і бессмяротнасці. У славянскіх паданнях і казках менавіта «маладзільныя» ці «райскія» яблыкі прыносілі поспех і здароўе старому бацьку, надавалі сілу палахлівым, рабілі прыгажуняй звычайную дзяўчынку. Але атрымаць іх было няпроста: для гэтага неабходна было вытрымаць шмат выпрабаванняў у трыдзевятым царстве.

У сямейна-радавых абрадах усходніх славян яблыня з'яўлялася сімвалам пладаноснасці і дабрабыту.

● Ваду пасля першага рытуальнага купання хлопчыка неабходна было выліць пад яблыню, каб прадоўжыў свой род (менавіта яблыню лічылі мужчынскім, а значыцца «родавым» дрэвам).

● Калі ў сям'і памёр прадстаўнік мужчынскага роду, неабходна было ссекчы самую прыгожую і пладаносную яблыню — «зрабіць ахвяру». Тым самым старыя людзі перасцерагалі сад ад заўчаснага высыхання і адмірання.

● У той жа час, калі без усялякай прычыны ў садзе высыхала яблыня, казалі, што ў сям'і нехта хутка памрэ па мужчынскай лініі, і перш за ўсё хвалявалася за гаспадара.

● Выраз «зямля яблыкам пахне» азначаў не што іншае, як смерць кагосьці са сваякоў.

● Ссякаць яблыню, напрыклад, пры будаўніцтве хаты ці з іншай нагоды, катэгарычна забаранялася. Па вераваннях нашых продкаў «менавіта на яблыні звычайна адпачывае Прачыстая Маці, калі сыходзіць на зямлю».

● Тым бацькам, асабліва матулям, у каго памерлі дзеці, да Яблычнага Спаса (19 жніўня) нельга было ўжываць яблыкі новага ўраджаю. Існавала паданне, што ў гэты дзень Бог раздае ўсім заўчасна памерлым дзецям пачастункі, у тым ліку і яблыкі. Калі ж бацькі памерлага дзіцяці парушаць забарону, то іх дзіця застанецца без падарунка.

● У гэты дзень неабходна было асвяціць яблыкі новага ўраджаю, занесці на магілу памерлага дзіцяці (калі гэта немагчыма, пакласці на любую іншую магілу, дзе пахавана дзіця з такім жа імем) і толькі пасля гэтага есці.

● Народныя знахары раілі выкарыстоўваць яблыкі ў якасці «прысушкі». Для гэтага неабходна было пакласці ў разрэз яблыка паперку з напісаным на ёй іменем каханага чалавека, а затым пакласці на сонца. Паступова, як яблык пачне сохнуць, так і сэрца каханага пачне «сохнуць» па той, якая варажыла.

● Паўсюдна існавала прыкмета: калі са стала зваліўся яблык — чакай каханага.

● Каб перасцерагчы дзіця ад злоўжывання спіртным у дарослым узросце, яго ў дзяцінстве «замаўлялі». Пры гэтым дзіця абавязкова кармілі печаным яблыкам.

● З дапамогай яблыка народныя лекары зводзілі бародаўкі. Для гэтага неабходна было падзяліць яблык на столькі частак, колькі было бародавак. Кожнай часткай трэба было пацерці бародаўку, а затым яблык скласці ў цэлае і закапаць там, дзе ніхто (ні чалавек, ні жывёла) не ходзіць. Калі яблык згніе ў зямлі, знікнуць бародаўкі.

Акрамя гэтага, народныя знахары раілі піць яблычны воцат ад высокага ціску.

У народнай культуры адносіны да пладаносных дрэў былі вельмі асцярожныя. Існаваў шэраг правілаў, якія былі абавязковымі для выканання:

● Тры гады з маладых яблынь ці груш неабходна было зрываць кветкі, каб у будучым на гэтым дрэве быў добры ўраджай.

● Пакуль яблыкі і грушы не паспеюць, дрэва нельга трэсці, плады можна знімаць толькі рукамі, інакш на наступны год на гэтым дрэве ўвогуле не будзе пладоў.

● Нельга, каб першыя яблыкі ці грушы з маладога дрэўца з'еў хто-небудзь чужы. Казалі, што ў такім выпадку завязь знікне не толькі на маладых, але і на старых дрэвах.

● Лекавыя якасці яблыкаў былі вядомыя нашым продкам здавён. Яблыкі ўжывалі свежымі, сушылі на зіму, варылі адвары, рабілі сок, воцат і г.д.

● Самае галоўнае правіла здароўя гучала так: «З'еш адзін яблык на дзень — і табе не спатрэбяцца ніякія дактары».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Інфарм-укол

МАСТАПАТЫЮ ПРАДУХІЛЯЕ МАЦЯРЫНСТВА

Калі падчас самастойнага абследавання малочных залоз вы намацалі невялікае ўшчыльненне, варта звярнуцца да ўрача. Магчыма, гэта мастапатыя — захворванне, якое можа з'явіцца нават у 15-гадовых дзяўчат.

Мастапатыя — гэта дысгармональнае захворванне малочных залоз. Яно яшчэ называецца фіброзна-кістознай хваробай, калі ў залозе адбываецца разрастанне злучальнай і жалезістай тканак, фарміруюцца ўшчыльненні і ўтвараецца адна ці мноства кістаў. Мастапатыя бывае дыфузная і лакалізаваная (вузлавая). Дыфузная адрозніваецца наяўнасцю маленькіх шчыльных участкаў — кістаў. Буйныя ж новаўтварэнні дазваляюць сказаць, што мае быць вузлавая мастапатыя. Захворванне не з'яўляецца проста так, яно абумоўлена шэрагам фактараў — гарманальнага ці псіхалагічнага збою, гінекалагічных хваробаў, дысфункцыі печані і г.д. У некаторых выпадках мастапатыя ўзнікае ў выніку аборту. Малочная залоза непасрэдна звязана з органамі, адказнымі за рэпрадукцыйныя функцыі, любое гінекалагічнае захворванне можа адбіцца і на яе стане. Малочная залоза рэагуе і на змяненні ва ўсёй эндакрыннай сістэме — печані, шчытападобнай і падстраўнікавай залозах, наднырачніках. Здаровая малочная залоза ў жанчын — удзячнасць прыроды за цяжарнасць, роды і кармленне дзіцяці. Менавіта таму самы натуральны спосаб лячэння мастапатыі — мацярынства. Наогул многае залежыць і ад ладу жыцця, узросту, перанесеных захворванняў.

Калі вузельчыкі вельмі малыя або знаходзяцца глыбока ў тканках, мамолаг накіруе вас на мамаграфію і ўльтрагукавое даследаванне. Магчыма, спатрэбіцца і тэст на анка-маркер — аналіз крыві, які дазваляе распазнаць некаторыя змяненні ў малочнай залозе. З дапамогай шпрыца ўрач зробіць пункцыю аднаго з буйных вузельчыкаў, даследуе матэрыял пад мікраскопам і ўстановіць якасць клетак ушчыльнення.

Калі ў мастапатыі вінаватая не адсутнасць мацярынства, то для паляпшэння працы печані, напрыклад, прызначаюць вітаміны групы В, А і С. Калі «вінаваты» нерэгулярны менструальны цыкл, парэкамендуюць аральныя кантрацэптывы. Акрамя таго, апошнім часам урачы нярэдка прызначаюць фітапрэпараты і гамеапатычныя сродкі.

Мастапатыя хоць і не з'яўляецца перадракавым захворваннем, аднак некаторыя яе формы могуць спрыяць развіццю злаякасных пухлінаў.

ШЫЗАФРЭНІЯ НЕБЯСПЕЧНАЯ НЕЛЯЧЭННЕМ

Шызафрэнія — захворванне, пры якім паступова нарастаюць такія змяненні асобы, як аўтызм, эмацыянальнае збядненне, з'яўленне дзівацтваў, расстройства мыслення, падзенне энергетычнага патэнцыялу, афектыўныя, галюцынаторныя і іншыя праявы.

Такія хворыя могуць разглядаць сябе як цэнтр усяго, што адбываецца. Часта парушаецца ўспрыняцце: колеры і гукі могуць здавацца надзвычай яркімі, а малазначныя рысы звычайных рэчаў — больш значнымі, чым увесь прадмет у цэлым. Мысленне становіцца нязносным, недакладным, думкі перарываюцца. Характэрны павярхоўны настрой з неадэкватнасцю. Паколькі для хворых на шызафрэнію характэрныя своеасаблівыя змяненні асобы і паводзінаў, што можа прымаць непрыемныя і нават небяспечныя формы, з гэтым захворваннем звязана шмат стэрэатыпаў. Пры адсутнасці належнага лячэння такія хворыя гінуць у выніку самазабойства.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

Рыбаводы настойваюць на недапушчальнасці эксперыментаў з запускам у беларускія азёры акварыумных рыбаў

Развядзенне акварыумных відаў рыбаў у беларускіх азёрах можа негатыўна паўплываць на іхтыяфаўну рэспублікі. Аб гэтым на прэс-канферэнцыі паведаміў галоўны рыбавод ДПУ «Нацыянальны парк «Браслаўскія азёры» Юрый Палуцкі, каментуючы сітуацыю з павелічэннем колькасці ратана ў Беларусі.

Ён зазначыў, што з'яўленне гэтай невялікай, але вельмі пражэрлівай паўднёвай рыбкі ў нашых краях — адзін з прыкладаў няправільных і «неразумных» дзеянняў акварыумістаў, якія парушылі натуральныя прыродныя працэсы. І зараз у многіх вадаёмах, дзе завёўся іншаземны засланец, зніклі такія традыцыйныя для Беларусі рыбы-старажылы, як плотка, акунь, пячкур.

Асабліва небяспечны ратан для невялікіх сажалак, дзе ён за кароткі тэрмін можа выцесніць усіх іншых насельнікаў, з'ядаючы лічынкі насякомых, планктон, ракападобных, г. зн. тое, што ўжываюць у ежу і іншыя азёрныя рыбы. Але з'ядае ён усё гэта ў вялікай колькасці, абяздольваючы суседзяў. Галоўную ж шкоду ён наносіць іх патомству, знішчаючы масу ікры і малькоў.

«Для запуску любога новага віду рыбаў неабходна ўзгадненне з рознымі міністэрствамі, прыродаахоўнымі і навуковымі арганізацыямі, дэпартаментам па меліярацыі, каб не нашкодзіць прыродзе», — патлумачыў Юрый Палуцкі.

Ратан — адзіны прадстаўнік роду галавешак. Яго радзіма — басейн Амура. Але затым гэта рыба распаўсюдзілася па ўсёй Паўночнай Еўразіі ад Еўропы да паўночна-ўсходняга Кітая і Паўночнай Карэі. У даўжыню дасягае 25 см. Жыве да 7 гадоў у стаячых водах.

Надзея РАДЗІВОН, БЕЛТА.

КІРМАШ штотыднёвы рэкламны выпуск № 25 (593)
аддзел рэкламы ☎ 287 17 79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінск, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АББЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

Дом памерам 6х8, можна пад знос, у в. Галынь Навагрудскага раёна.
Тэл.: 71 479, 253 35 69.

Дом драўляны, можна пад знос, у Слуцкім раёне.
Тэл.:8 01771 76 228, маб. 871 20 76.

Катэдж 2-павярховы, маецца газ, вада, 40 км ад г. Ліда, каля ракі Нёман, сад, агарод, 18 тыс. у.а.
Маб. тэл. 889 95 10.

Кватэра 3-пакаёвая, кааператыўная, маецца тэлефон, гараж у райцэнтры Гарадок.
Тэл.: 8 0212 48 08 09, 8 029 216 17 09.

Кватэра 2-пакаёвая ў г. Мінску па вул. Асіпенкі.
Тэл.: 8 017 233 33 40, сот. 568 43 04.

Супермлын, 2 тоны ў гадзіну, 4 кВт, тэрмінова, нядорага.
Тэл.: 8 033 637 70 54, 8 017 253 55 40.

Козы дойныя, узрост 1,5 года, белыя, бязрогія і племянны казёл.
Тэл.: 8 02234 35 646, 8 044 714 17 20.

Добрыя козы і 6-месячны племянны козлік. Звяртацца: 222217, в. Жажэлка, вул Зарэчная, 18 Смалявіцкага р-на.

«Нісан-прымера», 1998 г.в., універсал, 2,0 ТД, ц/замок, электрападагрэў сядзенняў.
Тэл. 8 029 635 64 55.

«Масквіч-412», можна на з/ч.
Тэл.:сот. 190 30 14, 8 01770 65 737.

Бульбакапалка лідская, навясная, двухрадковая, вуллі, электрапліта.
Тэл.: 8 01792 55 725, сот. 961 02 68, 931 82 28.

Трактар МТЗ, Т-40АМ, ЮМЗ-6 у добрым стане.
Тэл.: 8 01718 42 458, маб. 391 23 56.

«Міцубісі карызма», 1997 г.в., 1,8 б., серабрысты металік, люк, фаркоп, СД-магнітола, кандыцыянер.
Тэл. 8 033 635 09 53.

Трактар Т-42 з дакументамі, бульбакапалка 2-радковая, акучнік, збівалка.
Тэл. 8 033 635 09 53.

КУПЛЮ

Капалку аднарадковую
Тэл.: 8 029 935 12 44, 8 01717 48 644.

РОЗНАЕ

Шукаем кватэру ў г. Мінску для траіх студэнтаў, парадак і аплату гарантуем. Удзячнасць — адпачынак у Браславе ў любы час.
Тэл.: 8 02153 36 459, 8 029 682 79 05.

Мяняю прычэп да УАЗ-469 на прычэп да легкавога аўто або мотаблока.
Салігорскі раён, тэл. 27 95 82.

Мяняю 4-пакаёвую прыватызаваную кватэру ў г. Слуцку на 2-пакаёвую ў г. Мінску.
Тэл.: 8 01795 25 156, маб. 947 34 34.

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі:
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ваша прозвішча, адрас, хатні тэлефон.

Пашпарт серыя_____ № _____ Выданы_____

_____

Подпіс_____ Дата_____

Усміхнёмся!

— Чым адрозніваецца халасты мужчына ад жанатага?

— Халасцяк усё робіць па доме сам, а жанатага жонка прымушае.

☺

Рускі мужык можа вечна гляджэць на тры рэчы: адліў, прыліў і разліў.

☺

— Я сёння абараніў доктарскую!

— ???!

— Хуліганы хацелі адабраць пакет з каўбасой, але ж я адбіўся!

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.948 Індэкс 63850. Зак. № 4485. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12